мемуары

Валянцін Блакіт



..у...

# Уваскрасеньне ўчарашняга дня

## *Лірычна-дакументальны расповед*

*Працяг. Пачатак у №6 (31) за 2007 год і №1-2 (32-33)*

*Часопісны варыянт.*

Чамусьці атрымліваецца, што ў круглыя мае даты адбываюцца нейкія важныя, часам нават лёсавызначальныя падзеі, якія пакідаюць сьлед альбо робяць круты паварот у маім жыцьці. Выразна запомніўся 1948 год, калі яшчэ ня ведаў ні рыфмы, ні правілаў вершаскладаньня, напісаў свой першы наіўны і бездапаможны, але надзвычай крамольны верш. Ня памятаю з рыфмай ці бяз рыфмы апавядаў, як пускаю ў вясновыя ручаінкі папяровыя караблікі, і яны даплывуць да рова, а з рова па Спушанцы, Котры да Нёмана, па Нёмане – да сіняга мора, пераплывуць на той бераг і раскажуць, што жыве тут Сталін-зьвер. Свой “твор” не паказаў нікому, схаваў у гумне пад падрубу, дзе паперчыну струшчылі мышы. Потым гады два нічога не пісаў, але то быў, пэўна, першы падсьвядомы покліч да творчасьці. 1958 год стаўся літаральна пераломным у маім армейскім і, вядома, ня толькі армейскім жыцьці, калі на валаску вісела: альбо трыбунал за ўзброены напад на камандзіра, альбо нейкае амаль нерэальнае выратаваньне, пра што амаль з дакументальнай дакладнасьцю напісаў пазьней

у аповесьці “Вяртаньне на Саарэмаа”. А 1968 год крута павярнуў маю журналісцкую біяграфію – нечакана і неспадзявана патрапіў на партыйную работу, думаў на які год-два, а яна ўсё доўжылася і доўжылася. Нешта мусіла адбыцца і ў чарговы юбілейны 1978 год. Яно і насамрэч адбылося, якраз напярэдадні саракагоддзя...

Пад канец лета наш цэкоўскі санаторый “Місхор” у Крыме, звычайна, нагадваў сход рэспубліканскага партыйна-гаспадарчага актыву. Хто ў люксе-бункеры з усімі дамачадцамі, хто ўдвух з жонкай ці мужам, але больш уадзіночкі. Тут завязваліся ці ўмацоўваліся прыяцельскія стасункі, у неафіцыйных, нефармальных абставінах на прагулцы, на пляжы ці за чаркай у нечыяй палаце рашаліся важныя службовыя пытаньні, прызначэньні, вылучэньні, на выхадзе са сталоўкі можна было даведацца самыя сьвежыя навіны з Беларусі, у тым ліку і тыя, што яшчэ павінны адбыцца. У першы ж дзень прыезду на вялікае зьдзіўленьне даведаўся, што мяне пераводзяць у ЦК, і нават прычыну гэтага пераводу: нібыта з пашырэньнем зоны ўпэўненага прыёму тэлебачаньне стала іграць першую скрыпку сярод сродкаў ідэалагічнага ўзьдзеяньня на масы, таму пачалося ягонае кадравае ўмацаваньне – дырэктарам праграмаў нядаўна кінулі аднаго з намесьнікаў Паўлава Каваленку, а старшынём Дзяржтэлерадыё толькі што прызначаны вядомы паэт, галоўны рэдактар “Маладосці”, былы ўласны карэспандэнт “Правды” па Беларусі Генадзь Бураўкін, перад якім пастаўлена задача карэнным чынам павысіць ідэйны і творчы ўзровень тэлеперадачаў. У зьвязку з гэтым узьнікла партэба мецъ у ЦК куратарам тэлерадыё чалавека творчага і адначасова вопытнага партыйнага работніка, кампетэнтнага ў пытаньнях тэлебачаньня, радыё, літаратуры і мастацтва. Лепшай за маю кандыдатуру, быццам бы не знайшлі...

Усё гэта нібыта і было падобна на праўду, але я ня надта даваў веры, каб прымаць усур’ёз – колькі гэтакай інфармацыі так і застаецца на ўзроўні плётак-пагалосак!.. Апроч усяго, шчыра кажучы, яшчэ ня ведаў, ці хачу, ці варта пераязджаць у Менск. Праз колькі дзён у Місхор прыехаў Міхаіл Вырвіч, інструктар аддзелу прапаганды ЦК, з якім мы даўно добра зналіся як журналісты, і адразу ж сталі бавіць час у адной кампаніі. Ён прывёз сякую-такую цікавую для мяне канфідэцыйную інфармацыю аб перамовах Паўлава і Кузьміна з Емяльянавай і Кляцковым аб маім пераводзе ў Менск, нібыта дайшло да Машэрава, які сказаў: як сам вырашыць – так і будзе. Міхаіл па-сяброўску параіў добра падумаць, перш, чым прыняць рашэньне. У мяне склаліся даверлівыя, нават прыяцельскія стасункі са многімі работнікамі аддзелу прапаганды, і быў добра наслуханы пра цяжкі характар Паўлава, хоць мае асабістыя сустрэчы і гаворкі з ім пакінулі вельмі прыстойнае ўражаньне аб ім, перш за ўсё як аб чалавеку дзелавым, рашучым. У час прагулак тэт-а-тэт Міхаіл прыадкрыў мне шмат якія таямніцы аддзельскага “мадрыдскага двара” і я падумаў: насамрэч варта агледзецца і ня лезьці на скрут галавы...

Тыдзень адпачынку, што яшчэ заставаўся пасьля санаторыю, я намерыўся правесьці дома ў вёсцы – калі пройдуць дажджы, то патраплю на самыя грыбы, а лепшага адпачынку для душы, чым пахадзіць з кашом па запаведных баравіковых мясьцінах, ніколі для мяне не існавала і не існуе. Ды, як кажуць, не загадвай наперад. Не пасьпеў вярнуцца з Місхору, як паступіла каманда – тэрмінова быць у ЦК, у Паўлава. Еўдакія Яфімаўна Емяльянава расказала пра перамовы наконт мяне з Паўлавым і Кузьміным. Амаль нічога новага яна не паведаміла, апроч службовай персьпектывы, якая чакае мяне, калі адмоўлюся і застануся ў Гародні: праз год-два – пасада загадчыка аддзелу, а праз нейкі час з ейным выхадам на пенсію – сакратарская. Першае, канешне ж, магло быць рэальным, а другое – чыстай вады фантастыка: ніхто не дапусьціць дээмансіпацыю ідэалагічных кадраў. Але самае галоўнае – партыйна-чыноўная кар’ера мяне зусім перастала цікавіць, задавальняла

цалкам цяперашняя пасада, якая добра сумяшчалася з літаратурнай працай, таму зьязджаць з Гародні, дзе так хораша пішацца-працуецца не хацелася. Але спакваля даймалі і іншыя: а чаму гэтак жа хораша пісацца-працавацца не павінна ў Менску? Там літаратурны асяродак, там усе выданьні, у рэшце рэшт туды толькі што перабраўся Быкаў, пачувае сябе някепска. І яшчэ вельмі цікавым, заманлівым падаваўся тэлерадыётандэм з няўрымсьлівым рупліўцам беларусчыны Генадзем Бураўкіным, з кім пасьпеў добра падружыцца... Адно насьцярожвала, палохала – невядома, як з маім характарам складуцца стасункі з Паўлавым. Але супакойваў сябе: а што Паўлаў! Атрымаю кватэру ў Менску, а там – што будзе то будзе... У рэшце рэшт, калі наскочыць каса на камень, – плюнуць на ўсё ды падацца ў якую-небудзь газету ці часопіс. А куды ў Гародні падасіся, калі надыйдзе час разьвітвацца з абкамам...

Ехаў у ЦК начным гарадзенскім цягніком, канчаткова і адназначна не вырашыўшы для сябе: згаджацца ці адмаўляцца. Як кажуць, і хочацца, і колецца, і мамка не дазваляе. Цягнік прыбываў у Менск раненька, і ўжо да дзевяці я быў у прыёмнай загадчыка аддзелу прапаганды і агітацыі ЦК Савелія (за вочы ўсе звалі яго Саўкам) Яфімавіча Паўлава. Сакратарка падміргнула з разуменьнем: што, у нашым палку прыбыло? І без усялякіх удакладненьняў прапусьціла ў шэфаў кабінет. Масіўная фігура Паўлава аж выпраменьвала прыязнасьць, зычлівасьць, дэмакратычнасьць, і я зноў засумняваўся, што ўсё чутае пра ягонае самадурства, праўда. Ён адразу ж адклаў убок сьвежыя газеты, стоячы павітаўся, і калі я сеў ля прыстаўнога століка, пачаў без усялякага ўступу, ледзь ці не па-сяброўску:

– Я вельмі хачу, каб вы згадзіліся і прыйшлі ў аддзел...

Словам, неўзабаве мы былі разам паверхам вышэй у сакратара па ідэалогіі Кузьміна, якога ня раз слухаў на розных нарадах, семінарах. У ягоным кабінеце, зрабіў для сябе адкрыцьцё: аказваецца, ён надзвычай цікавы, разумны, уважлівы суразмоўца. Кузьмін літаральна зачараваў і сваёй простасьцю, даступнасьцю, і жывымі, маладымі, дапытлівымі з лёгкай хітрынкай вачамі, і ўменьнем слухаць суразмоўцу, і незвычайнай мяккай тактоўнасьцю.

Тады я і не здагадваўся, якую ролю адыграе гэты чалавек у маім лёсе...

Належала яшчэ пабыць на гаворцы ў загадчыка аддзелу аргпартработы Якушава, другога сакратара ЦК Аксёнава і, нарэшце, заручыўшыся іхнімі візамі, ісьці да самога Машэрава. Да Якушава і Аксёнава мусіў суправаджаць па рангу хто-небудзь з намесьнікаў Паўлава, аднак на гэты даволі фармальны абавязак ня надта зважалі і суправаджаць з дакументамі ў папачцы даручылі інструктару Міхаілу Вырвічу. Да Машэрава, канешне ж, мусіў весьці як мінімум сам Паўлаў. Аднак адбывалася ўсё чамусьці не ў планавы кадравы дзень, калі гутаркі з вылучэнцамі праходзяць першым чынам у начальства, таму прыёму ў Аксёнава давялося чакаць ледзь ці не да самага вечару. З Аксёнавым да гэтага давялося дзіўным чынам двойчы сутыкацца ў жыцьці, хоць пра тое ён, канешне ж, ня мог і здагадвацца. Першы раз, здаецца, у пятым ці шостым класе ў нашай вясковай бібліятэцы, калі нейкі прыезджы дзядзька дужа зьдзівіўся, што я прынёс здаваць "Железный поток" Серафімовіча, які прачытаць мне парэкамендаваў прыблудны сусед-грамацей Ягор Ціханаў. Незнаёмец тут жа ўчыніў мне экзамен па прачытанай кнізе і, пераканаўшыся, што насамрэч прачытаў і ўсё зразумеў, вельмі пахваліў. Ад бібліятэкаркі потым даведаўся, што гэта быў сакратар абкаму камсамолу Аксёнаў. А праз нейкіх пяць гадоў ён падпісваў мне, маладому супрацоўніку шчучынскай раёнкі, пуцёўку на Міжнародны фестываль моладзі і студэнтаў у Маскве, вядома ж, і не здагадваючыся, што перад ім той самы вясковы хлапчучок, які ў пятым класе асіліў "Железный поток". Канешне ж, і зараз ён ня мог здагадвацца, а нагадваць пра тое ў гэтых варунках з майго боку было б крайняй бестактоўнасьцю. На гэты раз Аксёнаў, палымяныя прамовы якога я ня раз слухаў з захапленьнем,

расчараваў, пакінуў непрыемны астой на душы, хоць гаварыў мне правільныя і разумныя рэчы, асабліва, калі стаў даваць характарыстыку з надзвычай высокімі ацэнкамі Генадзю Бураўкіну, які, на ягоную думку, унікальна і шчасьліва спалучае ў сабе паэтычны дар, высокія маральныя, чалавечыя якасьці, усебаковы інтэлект і выдатныя арганізатарскія здольнасьці аналітыка і палітыка буйнога маштабу, што надзвычай рэдка сустракаецца ў творчым асяроддзі. З гэтым я быў цалкам згодзен, як і з тым, што неабходна нам з ім працаваць у поўным паразуменьні і адным тандэме, дапамагаючы яму і аберагаючы ад розных зласьліўцаў, зайздросьнікаў, непрызнаных геніяў, якіх аж занадта сярод творчага люду.

Ад'езд у Менск супаў з маім саракагоддзем, і гэтыя дзьве падзеі адзначылі разам, у адзін прысяд. Гарадзенскія калегі падарылі мне на той час шыкоўны транзістарны радыёпрыёмнік рыжскай вытворчасьці, які спраўна служыць па сёньняшні дзень, і акуратна выгравіраваны цёплы надпіс на нікіліраванай аблямовачцы саграе душу, выклікаючы добрыя і ўдзячныя ўспаміны і аб працы ў Гарадзенскім абкаме на Замкавай гары, і аб сябрах-таварышах, шмат каго з якіх ужо, як і самога абкаму, няма на гэтым сьвеце...

Разьвіталіся шчыра, у шумным сяброўскім застольлі, хоць яшчэ амаль два гады быў павязаны з Гародняй, пакуль там заставалася сям'я – чакалі і, каб сын Сяргей закончыў на месцы дзесяцігодку, і здачы цэкоўскага дому па Пуліхава, каб атрымаць кватэру ў новым доме. Можна было і чакаць, маючы ладную страху над галавой у цэкоўскім інтэрнаце, празванага начлежкай. "Начлежка" была зусім побач – на спуску вуліцы Карла Маркса да Янкі Купалы ў квартале старых дамоў, пабудаваных яшчэ палоннымі немцамі, уяўляла сабой прасторную пяціпакаёвую двухузроўневую кватэру з асобным уваходам са двара. На першым паверсе, дзе была кухня, ванная, душ, туалет, у трох пакоях маглі пражываць па два-тры чалавекі, а на другім былі два аднамесныя пакойчыкі, адзін з якіх займаў галоўурач лечкамісіі Мікалай Міхайлавіч Макарэвіч з маладзенькай мілай і сімпатычнай жонкай Валечкай і маленькім сынам, другі – дастаўся мне, каму належала глядзець тэлевізар ня дзеля свайго задавальненьня, а ў сілу службовых абавязкаў. Хто больш, хто менш, але праз "начлежку" праходзілі ледзь ці ня ўсе работнікі ЦК, прызваныя ў Менск з перыферыі. Іншы раз яна амаль пуставала, іншы раз не было ніводнага месца, і тады некаму даводзілася перабівацца ў тлумным інтэрнаце ВПШ. Але гэта ня надта хвалявала часова бяздомных адказных работнікаў, паколькі кожны меў права на мэбліраваную аднапакаёўку з невялічкай куханькай і ўсімі іншымі камунальнымі выгодамі ды некалькімі соткамі для саду і градак за горадам у Атоліне, дзе быў прафілакторый ЦК. З раньняй вясны да позьняй восені сюды спачатку зусім бясплатна, а потым за сімвалічную плату курсіравалі цэкоўскія аўтобусы, пад вечар адвозячы, а раніцай дастаўляючы насельнікаў прафілакторыя і іхніх сямейнікаў у горад на работу. Летам рэдка хто заставаўся ў душным горадзе.

Ніякіх складанасьцяў у пераходзе на цэкоўскі рэжым работы не было – тая ж, што і ў абкаме, чыноўніцкая служба, толькі звужаная па службовых абавязках і адказнасьці да дыяпазону дзейнасьці Дзяржтэлерадыё. Гэта і лепш, што гранічна вызначана парафія, але паколькі тэлебачаньне і радыё займаюцца літаральна ўсім сьпектарам сацыяльна-эканамічнага, культурніцка-ідэалагічнага жыцьця грамадства, значыць, немагчыма было абмяжоўвацца нейкімі ведамаснымі рамкамі, вузкай сьпецыялізацыяй, і гэта таксама было добра. Кінулася ў вочы, што ў адрозьненьне ад абкаму ў калідорах ЦК надаецца куды большае значэньне розным субардынацыйным умоўнасьцям, ад чаго стасункі між работнікамі рознага ўзроўню і розных аддзелаў больш складаныя, чым у абкаме, зафармалізаваныя, ім часта нестае шчырасьці, непасрэднасьці, звычайнай чалавечай цеплыні і ўзаемавыручкі. Магчыма, мне, правінцыялу, гэта толькі напачатку падавалася, бо потым тое перастала заўважацца – ці то першае ўражаньне было памылковым, ці то чалавеку дадзена

да ўсяго прызвычайвацца. Асабліва зблiжала, ледзь ці не радніла жыцьцё-быцьцё ў Атоліне – і клопатамі на градках, і лазьняй па суботах, і рыбалкай на сажалках, і спаборніцтвамі на спартыўнай пляцоўцы, шахматнымі турнірамі, лыжнымі кросамі зімою, і, чаго ўтойваць, застольлямі па інтарэсах... Практычна з усімі работнікамі свайго аддзелу я быў знаёмы яшчэ з Гародні, а з некаторымі, як Коля Шоба, Міша Вырвіч, Міхал Дубянецкі, Міхась Парахневіч, якога больш чым каго еў поедам Паўлаў, аж пакуль ня выжыў у “Вячэрні Мінск”, і таго раней. Са многімі з іх меў прыяцельскія, мо нават сяброўскія стасункі. Ну і, канешне ж, наш гарадзенскі Мікола Жылінскі, які пасьля Мітронаўскай слабады асеў у сектары друку. У аддзеле аргпартработы працаваў мой паплечнік па мітронаўцы Жэня Рабко, а трохі пазьней і Валянцін Жвалеўскі, які ў свой час зьмяніў мяне ў абкаме на пасадзе загадчыка сектару, а потым з намесьніка рэдактара “Гродненской правды” падаўся па маіх сьлядах у Маскву.

Неяк адразу ж сышліся з непасрэдным шэфам Васілём Аляксандравічам Каленчыцам, былым рэдактарам брэсцкай абласной “Зари”, якога спачатку прызначылі загадчыкам сектару газетаў, часопісаў, выдавецтваў, а потым – намесьнікам загадчыка аддзелу. Ён ня надта трымаў нейкую службова-паказную дыстанцыю з падначаленымі, быў просты, адкрыты, непасрэдны, аўтарытэтны ў журналісцкім асяроддзі, са сваёй пазіцыяй, якую без аглядкі, часам ня надта цырымонячыся і зважаючы на пасады, мог выказаць кожнаму. Ён ведаў сабе цану і стаўленьне да сябе Машэрава. Васіль Аляксандравіч быў сьпецыялістам экстра-класу, узначальваў групу, якая даводзіла да ладу, рабіла апошнія філігранныя штрышкі самых адказных дакументаў, і перш за ўсё прамоваў, дакладаў, артыкулаў Машэрава, які без ухваленьня групы ня браўся ні чытаць прамовы, ні падпісваць артыкулы і іншыя дакументы. У групу, ці як яе звалі, мазгавы цэнтр, апроч Каленчыца, пастаянна ўваходзілі загадчык аддзелу планавых і фінансавых органаў Рыгор Вячорка, кіраўнік лектарскай групы Сіман Ходас, у якасьці эксьпертаў маглі прыцягваць каго заўгодна. Ні Каленчыца, ні Вячорку і Ходаса ад выкананьня сваіх непасрэдных службовых абавязкаў ніхто не вызваляў, і рэдка калі ім удавалася пакідаць будынак ЦК раней дзесяці вечару ці мець вольнымі выхадныя. Каленчыц стаў прыглядвацца да мяне і даручаць сёе-тое... Ня ведаю, якім чынам дайшло да Аляксандра Трыфанавіча аб спробе і мяне прыцягнуць да так званага мазгавога цэнтру, але неяк без аніякай патрэбы паклікаў мяне, запрасіў у пакой адпачынку, што лічылася найвялікшым даверам, прапанаваў кубачак кавы, цыгарэты і гэтак хітранька запытаў:

– А ты ўмееш пісаць левай нагой?..

– Ды-ы... – зьбянтэжыўся, разгубіўся я, не разумеючы, куды хіліць, што мае на ўвазе сакратар ЦК – ці не спадабалася яму падрыхтаваная мною нейкая паперчына?

Ён усьміхнуўся сам сабе, між іншым, як ён часта умеў сказаць нешта важнае ледзь ці не падтэкстам, працягваў:

– А ты паспрабуй іншы раз пісаць і левай нагой, каб адчапіліся, інакш – неба падасца з аўчынку... Пішы свае аповесьці і не сушы мазгі на... – Ён ня стаў даказваць, спадзяючыся на маю здагадлівасьць, і перавёў гаворку на нешта іншае...

Я ўсёк, і хоць гэта давалася няпроста, але... Ня мог толькі дазволіць сабе пісаць левай нагой, што мела непасрэднае дачыненьне да маіх службовых справаў і, канешне ж, для Кузьміна. Калі з першымі спраўляўся даволі проста, то з другім... Рабіць нейкі матэрыял ці дакумент для АТК (так, па першых літарах ледзь ці ня ўсе за вочы звалі Аляксандра Трыфанавіча) заўсёды было выпрабаваньнем. Асабліва па першым часе, пакуль ня ўведаеш ягонай методы і звычкі. Як бы ты ні выкладваўся, як бы не адшліфоўваў кожнае слоўца, кожны сказ мо ўжо ў дзясятым варыянце, можна было не сумнявацца, што гэта яшчэ ня ўсё, хоць ён вельмі па-

хваліў і падзякаваў. Не праходзіць і гадзіны, як імчыць памочнік Зіновій Прыгодзіч, якога потым зьмяніў мой аднакашнік па Мітронаўскай слабадзе Лёня Анішчанка з пакрэсьленым, сьпісаным ня дужа разборлівым почыркам АТК толькі што ўхваленым тэкстам. Расшыфроўваем, разумеем, што гэта ўсё куды горш, чым было, але воля аўтара ёсьць воля аўтара. Разам нешта апускаем, нешта выпраўлям, амаль упэўненыя, што гэта яшчэ не апошні варыянт. Бывала, ужо ля пад'езду чакае машына адвезьці АТК у аэрапорт ці ехаць некуды выступаць, а ён усё крэмсае тэкст, каб пасьля, як выйдзе за трыбуну заблытацца канчаткова ў сваіх праўкахпапраўках, і нічога не застанецца, як адкласьці паперчыну і выступаць без шпаргалкі. Тым ня меней змушаў рыхтаваць кожнае сваё выступленьне, нават калі гэта было нейкае звычайнае вітаньне. У адрозьненьне ад большасьці начальнікаў ён зусім спакойна ставіўся, калі правілі ці зусім выкідвалі напісанае ім, а праўкі, на ягоную думку, паляпшалі тэкст. Але гэтая думка трымалася нядоўга, і ён зноў мо ў дзясяты раз пачынаў перакрэмзваць, каб урэшце рэшт пагоршыць ці зрабіць зусім непрыдатным альбо непатрэбным, чаму аддадзена столькі чужых і ягоных нерваў, часу. АТК усё гэта разумеў, амаль заўсёды пачуваў сябе ніякавата перад тымі, чыя работа і час былі марна патрачаны па ягонай волі, але нічога ня мог зрабіць са сваім характарам, сваім глыбокім перакананьнем, што на сьвеце не існуе нічога абсалютна дасканалага, абсалютна ідэальнага, ня раз пры мне казаў, што нізашто ня можа прыпадобіцца тым, хто спакойна выходзіць за трыбуну, нават не прачытаўшы папярэдне падрыхтаваны падначаленымі ці памочнікамі тэкст. І вельмі любіў прыгадваць колішняга першага сакратара сталічнага гаркаму партыі Варвашэню – чалавека самабытнага, яркага, гаспадарлівага, сапраўднага народнага самародка, пры якім ён служыў загадчыкам аддзелу прапаганды і адначасова быў галоўным пісарам ягоных самых адказных дакладаў і прамоваў. Варвашэня амаль ніколі да выхаду за трыбуну не чытаў падрыхтаваныя яму прамовы, аж пакуль...

АТК у добрым гуморы любіў расказаць амаль анедактычную гісторыю, якая з ягонай ласкі адбылася з Варвашэнем на знакамітым пленуме ЦК КПБ, дзе неўзабаве пасьля сьмерці Сталіна па ініцыятыве Берыі абмяркоўваліся перагібы ў бок вялікадзяржаўнага рускага шавінізму, неадкладнай карэнізацыі нацыянальных кадраў у саюзных рэспубліках і пераходзе на нацыянальныя мовы, усталяваньні ленінскіх нормаў у нацыянальнай палітыцы. У сувязі з гэтым было намечана замяніць на пасадзе першага сакратара ЦК рускага Патолічава на беларуса Зімяніна. Ініцыятыва з Масквы сталася настолькі нечаканай, настолькі ня ўкладвалася ні ў якія звыклыя рамкі і ўяўленьні зрусіфікаванага, сьмяротна напалоханага нацыяналістычнымі жупеламі беларускага чынавенства, што яно анямела, разгубілася, ня верачы сваім вушам, успрымала ўсё гэта, як нейкі палітычны выверт. Толькі адчайныя аптымісты-летуценьнікі паверылі ў вяртаньне да задушанай у канцы дваццатых – пачатку трыццатых гадоў беларусізацыі, у тое, што насамрэч адкрываецца гістарычная перспектыва наладзіць у рэспубліцы сваё нацыянальна-культурнае жыцьцё. Але большасьць кансерватыўнага па сваім менталітэце, ня схільнага да пераменаў беларускага чынавенства ўспрымала кампанію насьцярожана, нават варожа. Разам з тым не магло, ня ў стане было аслухацца першапрэстольную, тым больш, што ініцыятыва сыходзіла ад самога ўсясільнага Лаўрэнція Паўлавіча, каго аслухвацца да нядаўняга часу мог толькі адзін чалавек – таварыш Сталін.

Патолічаў у рэспубліцы меў аўтарытэт і добрую рэпутацыю. Ён вывучыў беларускую мову, прыязна і з павагай ставіўся да нацыянальных і культурных традыцыяў народу, у вялікадзяржаўных шавіністычных замашках куды больш можна выло вінаваціць кіраўнікоў беларусаў па нацыянальнасьці, чым гэтага рускага. Таму да пленуму рыхтаваліся ўсур'ёз і грунтоўна. Абгаварылі, расьпісалі, хто павінен выступіць, што сказаць. Натуральна, запеўку павінен зрабіць кіраўнік самай буй-

ной – сталічнай партыйнай арганізацыі Варвашэня, адзін з вядомых кіраўнікоў камуністычнага падпольля і партызанскага руху на Меншчыне. Ён атрымаў абсалютна канкрэтныя ўстаноўкі, якія давёў свайму загадчыку аддзелу прапаганды і агітацыі Кузьміну, а той начыста праігнараваў усе, на ягоную думку, сумніўныя шэфавы ўстаноўкі, скляпаў самае што ні ёсьць кандовае выступленьне пра посьпехі і дасягненьні сталіцы, нафаршыраваўшы сотнямі лічбаў і прозьвішчаў перадавікоў, наватараў вытворчасьці. Як заўсёды, Варвашэня пайшоў за трыбуну, папярэдне не зазірнуўшы ў тэкст. Пад зьдзіўленыя, недаўменныя позіркі прысутных зачытаў падрыхтаваны банальны тэкст, дзе не было нават упамінку пра сутнасьць пастаўленага на абмеркаваньне пленуму вострага пытаньня. Вушлым партыйным чынавенствам гэта ўспрынялося як намёк, як нейкі сігнал. І іншыя сталі выступаць з аглядкай, а калі дайшло да галасаваньня – не хапіла галасоў вызваліць Патолічава. Гэта быў нечуваны скандал, нечаканы выклік Маскве. Варвашэню тут жа паклікалі на цугундзер: як гэта разумець?! Вы што, забыліся, пра што дамаўляліся?.. Гэта папахвае правакацыяй...

Учарнелы, разьятраны Варвашэня вярнуўся ў гаркам, паклікаў Кузьміна, выліў на яго ўсю сваю злосьць і тут жа падпісаў рашэньне аб звальненьні неслуха без прадастаўленьня нейкай іншай работы...

Ды зусім нядоўга прабыў беспрацоўным апальны Кузьмін – роўна столькі, колькі доўжылася тая нечаканая і дзіўная беларусізацыя: Берыю арыштавалі, абвясьціўшы ворагам народу, агентам замежных выведак, і ўсё вярнулася на кругі своя... У сталыя гады, пазнаёміўшыся з абнародаванымі дакументамі пра бурную рэфарматарскую дзейнасьць крывавага Лаўрэнція пасьля сьмерці Сталіна, так і не магу сабе адназначна адказаць, што гэта было: ці насамрэч празарлівае бачаньне, спроба перавесьці стрэлкі з тупіку, куды каціласяя краіна, на больш-менш цывілізаваныя рэйкі, ці проста каварная і хітрая палітычная гульня з адзінай мэтай – запалучыць абсалютную ўладу, а потым ужо вядомымі, адладжанымі метадамі ўправіцца і з рэфарматарамі, і з засьвечанымі нацыяналістамі? Хто ж яго ведае, як і куды магло павярнуцца...

Заўзятых беларусіфікатараў тады, канешне ж, не судзілі і не растрэльвалі, а проста паціху адных пазасоўвалі на наменклатурныя задворкі тут на месцы, другіх разам з прэтэндэнтам на першую ролю ў рэспубліцы Зімяніным забралі на малапрыкметныя пасады ў Маскву, а самога прэтэндэнта саслалі на дыпламатычную работу ў Манголію, трэціх адправілі на заслужаны адпачынак. Ніхто з іх так і не падняўся, хіба толькі Зімянін праз колькі дзесяцігоддзяў ужо ў шаноўным узросьце ўсплыў на саюзным партыйным алімпе на нейкіх дзясятых ролях, без членства і кандыдацтва ў палітбюро. А тады беларускую кампартыю, якая адзінай сярод саюзных рэспублік ня вызваліла свайго рускага першага сакратара, абвясьцілі ўзорам палітычнай сьпеласьці і інтэрнацыяналізму, а наймудрэйшым стратэгам і тактыкам прызналі сталічнага першага сакратара Варвашэню. Празарлівага Кузьміна той, вядома ж, вярнуў на ранейшае месца, адкуль і пачалося ягонае службовае ўзыходжаньне. А тая кароценькая, дзіўная беларусізацыя пакінула свой злавесны сьлед. Рускага Патолічава неўзабаве забралі на міністэрскую пасаду ў Маскву, і першай асобай у рэспубліцы ўпершыню стаў беларус па нацыянальнасьці Мазураў, пры якім вышэйшая школа стала цалкам рускамоўнай, а ў гарадах, раённых пасёлках, нават невялікіх мястэчках практычна вынішчана беларускае школьніцтва.

АТК любіў прыгадваць той павучальны эпізод у сваёй біяграфіі, калі трэба было падкрэсьліць неабходнасьць абачлівага стаўленьня да далікатных, непрадказальных і сьлізкіх нацыянальных пытаньняў і праблемаў, дзе асабліва чуйна трэба трымаць нос па ветры.

– Што меў бы, хто ведаў бы сёньня Варвашэню, каб ня тое дурное выступленьне на пленуме? – усьміхаўся пераможна. – А вось навечна займеў вуліцу ў самым

цэнтры Менску. Ні адзін з менскіх першых сакратароў пакуль што не ўдастойваўся такога гонару...

У публічных і нават што ні ёсьць прыватных выказваньнях па нацыянальных праблемах, палітыцы і практычных дзеяньнях маскоўскага кіраўніцтва АТК заўсёды быў крайне асьцярожны і абачлівы, зашпілены на ўсе гузікі. Ён пільна сачыў, каб у сваіх, дый ня толькі сваіх, выступленьнях, нейкіх дакументах з выхадам на Маскву прысутнічала дарэчы і недарэчы ўдзячнасьць вялікаму рускаму народу, старэйшаму брату за помач і падтрымку, ня менш пяці цытатаў, вернападданых кіўкоў і паклонаў у адрас "мудрага ленінскага Палітбюро на чале з верным ленінцам, правадыром сусьветнага пралетарыяту на сучасным этапе Леанідам Ільічом Брэжневым", а потым Юрыем Уладзіміравічам, Канстанцінам Усьцінавічам. Хоць, здаецца, як чалавек разумны, дасьведчаны ён ведаў цану кожнаму гэтаму "вернаму ленінцу", але не дазваляў сабе і паўнамёкам усумніцца ў прысутнасьці нават тых, каго любіў і каму давяраў. Пэўна, здагадваўся, а мо і ведаў, якія гаворкі пра геніяльнасьць састарэлых і амаразьмелых маскоўскіх правадыроў вядуцца ня толькі ў творчым, навуковым асяроддзі, але і ў калідорах, кабінетах ЦК, выключаючы, хіба, пяты паверх, дзе атабарваліся сакратары ЦК, іхнія памочнікі і сакратаркі і агульны аддзел, які ў бытнасьць Чарненкі непамерна разбух, надзьмуў шчокі, пачаў рэальна прэтэндаваць на пальму першынства ў партыйнай іерархіі. Іншы раз я, а часьцей непасрэдны і эмацыянальны Сяргей Законьнікаў, загадчык сектару літаратуры, "забываліся", дзе знаходзімся, і выдавалі ў кабінеце АТК тое, да чаго прызвычаіліся ўжо нашы вушы, і тады сакратар ЦК напалохана глядзеў па баках і папярэджваў, што нас слухае Нікулкін (тады старшыня КДБ). Мы недаўменна паціскалі плячыма: а што такога крамольнага, антыпартыйнага, антысавецкага мы гаворым?.. АТК незласьліва грaзіўся пальчыкам, казаў, што з КДБ лепш ня мець справы. Перад гэтай арганізацыяй у яго жыў нейкі містычны страх, хоць былы баявы штурман і ў вайну, і ў мірны час на сваёй высокай пасадзе быў не з палахлівага дзясятку, бадай, адзін з кіраўнікоў рэспубліканскага ўзроўню, членаў бюро ЦК, асьмельваўся апаніраваць, часам вельмі рэзка і жорстка самому Машэраву, выказвацца пра яго, ня дужа хвалюючыся, што праслухоўвае Нікулкін, сьведкам чаго міжволі і не міжволі быў і я. Асабліва, калі на два месяцы стаў ягоным памочнікам заместа Зіновія Прыгодзіча, прызванага на камандзірскія курсы ў так званую Мардасаўскую (па імені начальніка гэтых курсаў) дывізію, праз якую мусіў прайсьці кожны вайсковаабязаны наменклатуршчык ва ўзросьце, здаецца, да сарака пяці гадоў. Яна разьмяшчалася ў мікраараёне Зялёны луг на скрыжаваньні вуліцаў Славінскага і Каліноўскага, дзе зараз атабарылася прэстыжная вайсковая вучэльня. У свой час, калі быў яшчэ ў Гарадзенскім абкаме, і я весела пракантаваўся тут два вясновыя месяцы...

У памочнікаўскія абавязкі ўваходзіла быць заўжды пад рукою ў шэфа, штораніцы ўзгадняць і планаваць ягоны працоўны дзень: нагадаць, што засталося "вісець" з учарашняга, пазаўчарашняга, дзе яму абавязкова трэба быць сёньня, прадстаўляць сьпіс, хто і з чым рвецца на прыём, узгадніць, каго паклікаць, з кім пагаварыць і што каму сказаць па тэлефоне ці пры сустрэчы ад ягонага імені, каго дапусьціць, а каго і блізка не падпускаць да ягонага кабінету, прыдумваючы розныя, аж да фантастычных прычынаў, і перш за ўсё спасылаючыся на неймаверную занятасьць сакратара ЦК. Ну і, канешне ж, даводка да кандыцыі розных дакументаў і бясконцых варыянтаў ягоных важных і зусім дзяжурных выступленьняў. Прыходзіў ён, звычайна, у восем-палове дзявятай і адразу ж клікаў мяне: ну што там у нас на сёньня? Нeяк толькі распачаў дакладваць, як рэзка і патрабавальна завурчэў тэлефон, голас якога ня зблытаеш ні з якім іншым – прамы ад Машэрава. Адразу ж у іх пачалася гаворка на даволі высокіх танах, і я палічыў тактоўным хуценька рэціравацца з кабінету, аднак АТК рашучым жэстам спыніў, паказваючы пальцам

на крэсла ля прыстаўнога століка: сядзі! Я не зусім разумеў сутнасьць іхняй гэтакай нярвовай гаворкі, але быў зьдзіўлены, уражаны, што АТК здольны так пярэчыць самому Машэраву – ня проста пярэчыць, а зацята брацца з ім у рожкі. Неўзабаве пачуўся характэрны гук і частыя кароткія гудкі, што сьведчыла – Машэраў на паўслове паклаў трубку. АТК выразна, бы шукаючы падтрымкі, разьвёў рукамі: во, бачыш і прыпаліў чарговую цыгарэту. А праз хвіліну шумна адчыніліся дзьверы і ў кабінет рашучым, лёгкім крокам нават не зайшоў, а ўляцеў пачырванелы ад узбуджэньня Машэраў – высокі, стройны, як заўсёды, элегантна апрануты. Не пздароўкаўшыся, ён глянуў на мяне выразна, і мяне бы ветрам выдзьмула з кабінету. Шчыльна прыкрыў за сабой двайныя дзьверы, аднак яны толькі скажалі, а не глушылі іхнія галасы на высокіх нотах. Гаспадыня прасторнай прыёмнай Алена Фёдараўна затрывожана пыталася вачыма: з-за чаго гэта яны там? Што ж здарылася?! Я ведаў ня больш, чым яна, паціснуў плячыма... Не хвалюйся, супакоіла яна, ці першы раз яны так!.. І насамрэч неўзабаве галасы сталі аціхаць, а праз нейкі час адчыніліся дзьверы і ў прыёмную выйшаў Машэраў у суправаджэньні АТК. Яны прыпыніліся, спакойна і памяркоўна працягваючы гаворку, нібы атрасаючы рэшткі нядаўняга ўзбуджэньня...

І ўвогуле тады ніяк ня мог зразумець і па сёньня ня маю адказу, чаму надзвычай асьцярожны і абачлівы ў характарыстыцы маскоўскіх правадыроў АТК дазваляў сабе незалежныя, часам зусім крамольныя ацэнкі менскіх высокіх чыноў, не выключаючы і самога Машэрава, якога любіў і паважаў, аднак гэта не замінала апаніраваць яму. Нават пры падначаленых, сьведкам чаго я быў неаднаразова, АТК не хаваў свайго скептычнага стаўленьня да многіх пачынаньняў Машэрава – як усчатая масавая нарыхтоўка галінкавага корму, як татальнае вынішчэньне балотаў, як так званая матыльковая дыпламатыя з верталётнымі палётамі і пералётамі і г.д. І тут чамусьці ня надта клапаціўся пра вынікі ад магчымых вушэй Нікулкіна ці ад нечыіх даносаў. Пэўна, усё гэта ён выказваў у вочы Пятру Міронавічу. Памятаю, неяк у добрым гуморы ён нечакана завёў са мной даволі філасофскую гаворку пра чалавечыя слабасьці, найзаганьнейшымі з якіх лічыў угодніцтва, лізаблюдства. А потым на маё зьдзіўленьне задумліва і скрушліва сказаў: страшная гэта рэч... Во Пётр Міронавіч, нашто ўжо, здаецца, моцны, прынцыповы, разумны, а часам клюе, з ходу заглытвае самы што ні ёсьць прымітыўны, пячорны падхалімаж... Ці ўзяць тваіх пісьменьнікаў... Аднак нехта зайшоў у кабінет, і гаворка перапынілася. Вельмі шкада, бо ніколі больш да гэтай тэмы Аляксандр Трыфанавіч не вярнуўся, хоць я ня раз рабіў такія спробы – АТК быў чалавек настрою, у ягонай галаве ўвесь час раіліся думкі, ідэі, ён лёгка губляў усялякі інтарэс да таго, што яшчэ зусім нядаўна дужа хвалявала і клапаціла яго ці здавалася надзвычай важным, адметным і дасканалым. Ад таго, пэўна, і ягоныя бясконцыя праўкі і варыянты сваіх і чужых тэкстаў. Гэтыя бясконцыя і бясплённыя стылёвыя пошукі дасканаласьці, мусіць, і не далі магчымасьці напісаць свае, думаю, вельмі цікавыя і карысныя ўспаміны, за якія ня раз браўся, крэмзаў, выкідваў, зноў браўся, зноў заходзіў у тупік.

Ня ведаю за што, але да мяне ён заўсёды ставіўся вельмі прыязна, амаль пабацькоўску, як і да значна маладзейшага Сяргея Законьнікава, з кім прыйшлі мы ў апарат ЦК амаль адначасова, з розьніцай у некалькі месяцаў. Мо таму, што абодва мы былі ўжо больш-менш вядомыя літаратары, а да пісьменьнікаў у АТК быў асобны піітэт і павага. Дый ня толькі ў яго як сакратара ЦК па ідэалогіі. Статус пісьменьніка ў грамадстве тады быў надзвычай высокі, творцы карысталіся аўтарытэтам, іх паважалі, шанавалі, да іхняй думкі, іхняга слова прыслухоўваліся. Таму ўлады стараліся ставіцца да творчых людзей уважліва, дзе трэба падтрымаць, дзе трэба прыручыць, дзе трэба прыкарміць, дзе трэба прыжучыць. Апошняе амаль заўсёды рабілася прымітыўна. Як судовы працэс над Даніэлем і Сіняўскім, знакамітыя антыдудзінцаўская, антыпастэрнакаўская, антысалжаніцынская кампаніі

ў Маскве, з падачы і ініцыятывы ўсё той жа Масквы шальмаваньне Быкава. У нас пры Машэраве і Кузьміне ганебная антыбыкаўская кампанія паціху-памалу зьвялася на нішто, а Быкаў атрымаў належнае і заслужанае ўганараваньне, хоць ні на ёту не саступіў ад сваіх перакананьняў і прынцыпаў, стаў знакавай, культавай фігурай на Беларусі. Гэта потым улада, якая любіць абвяшчаць сябе народнай, фактычна выціснула народнага пісьменьніка ў эміграцыю. І яшчэ факт: Беларусь тады была адзінай у Саюзе рэспублікай, дзе ў навуковым і творчым асяроддзі абышлося без працэсаў над дысідэнтамі. Вядома ж, пры жаданьні можна было раздзьмуць не адно кадзіла... Чыя тут большая заслуга – кіраўніка рэспублікі, галоўнага ідэолага ці таго ж Нікулкіна, які, кажуць, быў вельмі прыстойным чалавекам? Пэўна, усіх трох. Але ў першую чаргу, вядома ж, Пятра Міронавіча, які ў адрозьненьне ад усіх сваіх папярэднікаў і спадкаемцаў на гэтай высокай пасадзе ўмеў браць на сябе адказнасьць, вельмі многае рашаць самастойна без аглядкі на Маскву, патрабаваць ад першапрастольнай лічыцца з ягонай думкай, ягонай пазіцыяй, інтарэсамі рэспублікі, ні да каго не падлізваючыся, прынцыпова адвяргаючы ўсе карупцыйныя сувязі і повязі, што пышным кветам буялі на прасторах метраполіі. І праз гэта рабіўся ўсё больш і больш чужым сярод сваіх, а ад чужакоў, як вядома, рана ці позна пазбаўляюцца, асабліва калі яны пачынаюць выклікаць рэальную небясьпеку. І тады, і сёньня праз чвэрць стагоддзя мала хто верыць у афіцыйную версію нібыта абсалютна выпадковай аўтааварыі на чыстай дарозе, што абарвала ягонае жыцьцё. Надта ж шмат вытыркоўвалася і працягвае вытыркоўвацца нестыковак, незразумелых супадзеньняў, дзіўных паводзінаў калег Машэрава па Палітбюро. Адбылося ўсё, калі не аціхалі настойлівыя пагалоскі аб маючым адбыцца переезьдзе параўнальна маладога, энергічнага і харызматычнага беларускага лідэра ў Маскву, дзе ён стане поўным членам Палітбюро і зойме адну з ключавых пасадаў у ЦК КПСС, а ў персьпектыве заменіць амаразьмелага і ледзьве жывога Брэжнева. Гэта было зусім рэальна – геранталагічныя праблемы крамлёўскага сінкліта сталі відавочна абвастрацца ўжо ня з кожным годам, а з кожным днём, і саюзная наменклатура ўсё больш і амаль адкрыта стала скіроўваць позіркі ў бок элегантнага, з жывой абаяльнай усьмешкай, ня толькі выдатнага аратара, але і таленавітага арганізатара, пад чыім кіраўніцтвам рэспубліка трымала лідзіруючыя пазіцыі па ўсіх накірунках эканамічнай і сацыяльна культурнай дзейнасьці, разам са сваім кіраўніком займела найвялікшы аўтарытэт і павагу ў Саюзе. Канешне ж, ён ня ўпісваўся ў сонм нямоглых, акамянелых крамлёўскіх старцаў, амаль кожны з якіх марыў хоць на сьмертным адры паруліць з крэсла Генсека. Рэальны канкурэнт ім, іхнім кланам, чужак, які невядома яшчэ, як павядзе сябе... У гэтым сьвятле ўзьнікалі і ўзьнікаюць пытаньні кшталту: чаму і ці выпадкова міліцэйскія машыны суправаджэньня, груба парушыўшы строгія інструкцыі, на час аварыі адарваліся ад машыны Машэрава? Куды падзеўся з месца аварыі чамаданчык, які браў з сабою Машэраў? Чаму канкрэтныя вінаўцы абмежаваліся толькі лёгкім спалохам, а вадзіцель самазвалу, які без падачы сігналу рэзка затармазіў перад самым носам грузавіка, змусіўшы ягонага вадзіцеля выскачыць на сустрэчную паласу, нават не фігураваў на працэсе? Урэшце рэшт, чаму міністр унутраных справаў, якога па логіцы рэчаў павінны былі тут жа прагнаць з пасады і прыцягнуць да адказнасьці за незабесьпячэньне аховы першай асобы з найцяжэйшымі пасьледкамі, як ні ў чым не бывала працягваў займаць свой высокі кабінет, больш таго – усяго праз нейкі месяц указам з Масквы быў уганараваны да дня міліцыі ледзь ні самым высокім ордэнам? Выклікае недаўменьне, наводзіць на роздум і тое, што Масква не дазволіла кіраўніцтву рэспублікі абвясьціць жалобу на дзяржаўным узроўні, а на кар'еры ейнага ініцыятара старшыні Савету Міністраў Аксёнава, найбольш верагоднага і натуральнага прэтэндэнта на пост Першага, пастаўлены быў крыж. Ад імя Палітбюро і Савецкага ўраду на пахаваньне дазволілі прыехаць толькі

паплечніку Пятра Міронавіча па партызанцы і камсамолу, ягонаму асабістаму сябру Міхаілу Васільевічу Зімяніну, які толькі што прыйшоў з “Правды” ў ЦК адным з радавых сакратароў, што дапамагалі нямоглым старцам кіраваць замацаванымі за імі напрамкамі партыйнай дзейнасьці. Казалі, парываўся прыляцець разьвітацца і намесьнік прэм’ера Касыгіна Ціхан Якаўлевіч Кісялёў, які пры Машэраве шмат гадоў узначальваў беларускі Саўмін, але яго пасьпелі ўжо вызначыць у пераемнікі нябожчыку і строга наказалі: аслухаешся – ня бачыць Менску і машэраўскага кабінету, як сваіх вушэй... Такое стаўленьне да памяці заслужанага і аўтарытэтнага кіраўніка рэспублікі, кандыдата ў члены Палітбюро, Героя Савецкага Саюзу, якое заслужыў крвёю ў гады вайны, і Героя Сацпрацы, атрыманае за рэальныя справы, не адпавядала, выламлівалася з самых элементарных нормаў наменклатурных пратаколаў і рытуалаў, успрымалася як абраза, непавага і, натуральна, яшчэ больш узмацняла недавер да афіцыйнай версіі прычыны аварыі... Хто ж яго ведае, хто ж яго ведае... Несумненна толькі адно: позна ці рана, але таемнае робіцца яўным...

З Пятром Міронавічам за два гады работы ў ЦК пад ягоным кіраўніцтвам мне не даводзілася сутыкацца настолькі, каб ён асабіста ведаў мяне. Як ўжо казаў, я нават не патрапіў на абавязковую гаворку да яго пры залічэньні ў штат апарату ЦК, якая мяне запэўнівалі абавязкова адбудзецца пасьля, пры зручным выпадку, але такога выпадку так і не надарылася. Пэўна ж, ён ведаў, што ёсьць работнік з такім прозьвішчам – праглядваў асабовую справу, падпісваючы пастанову бюро аб прызначэньні, а потым маё цэкоўскае пасьведчаньне. Дакладна ведаю толькі, што ён аднойчы зьвярнуў на мяне пільную ўвагу на нейкай нарадзе, куды я прыпёрся з Гародні без пінжака, у льнятой кароткарукаўцы і сярод публікі, спрэс апранутай у модныя тады неймаверна белыя нейлонавыя кашулі, пад якімі макрэе сьпіна нават у прахалоднае надвор’е, і чорныя пінжакі з такімі ж чорнымі вузенькімі нейлонавымі гальштукамі выглядзеў непачцівай белай варонай, пачуваў сябе ледзь ці ня голым. Зладзюкавата прыладкаваўся за нечай даволі масіўнай сьпіной збоку ў перадапошнім радзе, каб не калоць вочы прэзідыуму, а найперш Машэраву. І вось ён зьявіўся з-за кулісаў, а за ім – гуськом астатнія члены бюро. Машэрава не прынята было сустракаць уставаньнем. Ён уважліва агледзеў залу, спыніў позірк на мне, ад чаго я аж уціснуўся ў крэсла, усьміхнуўся, падалося, нават падміргнуў з разуменьнем, зьняў пінжак і гальштук, якія падхапіў падасьпелы з-за кулісы памочнік. І тут жа, як па камандзе, пад вясёлы шумок у зале сьпешна пачаў пазбаўляцца гальштукаў і вызваляцца з пінжакоў увесь прэзідымум, прыладжваючы іх ззаду сябе на сьпінкі крэслаў, і амаль адначасова ўсчаўся ўсеагульны шумны рух у зале. Пётр Міронавіч моўчкі цярпліва чакаў, а на ягоным твары лунала характэрная машэраўская гарэзьлівая ўсьмешачка, здавалася, ён вось-вось гатовы быў пырснуць вясёлым сьмехам...

Кажу пра гэты малазначны забаўны выпадак, каб яшчэ раз прыгадаць народную мудрасьць: які поп – такі і прыход. Людзі заўсёды імкнуцца быць падобнымі на свайго куміра, а падначаленыя – свайго кіраўніка, незаўважана, міжволі пераймаюць ягоныя звычкі, ягоны стыль. Магчыма, і ў АТК паважнае стаўленьне да пісьменьнікаў, увогуле да творчых людзей сыходзіла ад Пятра Міронавіча, які меў ня столькі службовую, колькі чалавечую, духоўную патрэбу бачыцца, гаварыць, выслухоўваць іх і ў фармальнай абстаноўцы на зьездах ці важных пленумах, дзе лічыў патрэбнай і абавязковай сваю прысутнасьць, і знаходзіў час без усялякай затрымкі і валакіты прымаць любога творчага чалавека, які папрасіцца, у сваім рабочым кабінеце, і сустракацца ў нефармальных абставінах у час традыцыйных творчых семінараў на Нарачы, і бываць на выставах і ў майстэрнях мастакоў. Ад блізкіх да яго людзей ведаю, што ў Машэрава была партэба калі ня ўважліва чытаць, то праглядваць ледзь ці ня ўсё, што выходзіла з-пад пяра

беларускіх літаратараў. Пра аўтараў і іхнія творы ён меў сваю дакладную і даволі прафесійную думку, але амаль ніколі не выказваў яе, каб не навязваць нікому, тым больш абвяшчаць яе ісьцінай у апошняй інстанцыі. Выключэньнем была, хіба, ягоная станоўчая ацэнка літаратурный вартасьці ананімнай паэмы "Сказ пра Лысую гару", што распаўсюджвалася ў машынапісных і ад рукі перапісаных копіях. Ці то ўсур'ёз, ці то каб уведаць рэакцыю ейных герояў, прапанаваў надрукаваць "Сказ" у "Вожыку", аднак, як і варта было чакаць, яны ўзмаліліся: не трэба! Канечне ж, станоўчы водгук Машэрава тут жа ахаладзіў гарачыя галовы, якія намерыліся кваліфікаваць таленавіты твор як дысідэншчыну, нелегальшчыну, кінуць усе сілы адпаведных органаў на пошук аўтара, каб найстражэйшым чынам пакараць яго.

І яшчэ Пётр Міронавіч меў звычку сумнявацца ў сваім першым уражаньні ад прачытанага твору, праз нейкі час вяртаўся да яго наноў і, бывала, каардынальна мяняў ранейшую думку. Пра гэтую Машэраўскую рысу ўзгадвалі многія старэйшыя пісьменьнікі, у прыватнасьці Іван Антонавіч Брыль у сваёй апошняй прыжыцьцёва выдадзенай кніжцы "Парастак". Машэраў з найвялікшай павагай і пашанай ставіўся да пісьменьніцкай і ўсякай іншай творчай працы, саміх творцаў, што не магло заставацца па-за ўвагай і ня ўлічваць гэта чуйнай на любы начальніцкі чых чыноўнай брацііі. Пісьменьнікі, і ня толькі плацілі Пятру Міронавічу тым жа. Я не сустракаў ў творчым асяроддзі людзей, якія казалі нешта кепскае пра Машэрава, таілі крыўду ці злосьць. Як і ў кожнага чалавека, у Пятра Міронавіча былі свае любімыя аўтары, блізкія яму як людзі, хоць гэтага ён намагаўся не выказваць уголас, публічна. Калі меркаваць па цытатах і спасылках на сучасную беларускую літаратуру ў ягоных прамовах і дакладах, якія, ведаю, заўсёды рабіліся толькі пры ягоным асабістым удзеле, то найбліжэйшымі па духу яму былі Пятрусь Броўка, Кандрат Крапіва, Пімен Панчанка. Для нас у апараце ЦК не было сакрэтам, што Першы нават імя яшчэ жывога тады мудрага патрыярха і класіка нашай літаратуры Кандрата Кандратавіча вымаўляе з нечуванай для начальства гэтакага рангу пачцівасьцю. Як і амаль свайго равесьніка Пімена Панчанкі. Але асабліва цёплыя, мо нават сяброўскія пачуцьці былі ў яго да земляка і цёзкі Петруся Броўкі. Гэта ён ўгледзеў у немаладым ужо паэце незапатрабаваны арганізатарскі талент, неўтаймаваную энергію, жалезную гаспадарніцкую хватку і рашыў скіраваць іх на рэалізацыю сваёй маштабнай задумы – пачаць з нуля, на голым месцы грандыёзную нацыянальна-культурніцкую справу, якая паставіць беларусаў у шэраг найбольш культурна-разьвітых нацыяў: у гранічна кароткі тэрмін ажыцьцявіць падрыхтоўку і выданьне першай шматтомнай універсальнай нацыянальнай энцыклапедыі. Напачатку, кажуць, Пётр Усьцінавіч вельмі аднекваўся, спасылаючыся на свой пенсійны ўзрост і літаратурныя планы, але адмовіць Пятру Міронавічу ня мог, і закасаўшы рукавы ўпрогся ў новую, незнаёмую справу, нават не падразраючы, што яна стане найгалоўнейшай місіяй ягонага жыцьця. Толькі з ягонай кіпучай энергіяй, інтуіцыяй дасьледчыка і літаратурным аўтарытэтам, уменьнем браць адказнасьць за гранічна магчымае на той час аб'ектыўнае асьвятленьне самых вострых, заблытаных афіцыйнымі вульгарызатарамі і загнаных у цянёты ідэалагічных табу праблемаў і слынных імёнаў айчыннай гісторыі, культуры, грамадскай думкі. Пад кіраўніцтвам Броўкі створаны ім малады, таленавіты калектыў энтузіястаў ледзь ці не на адным дыханьні на высокім навуковым узроўні, пра што сьведчыць ацэнка сьпецыялістаў ААН, якія прызналі першую беларускую нацыянальную энцыклапедыю адной з лепшых і дасканалых у сьвеце, ажыцьцявіў насамрэч падзьвіжніцкую культурніцка-асьветніцкую місію. Канечне ж, без усялякага перабольшаньня можна сказаць, што яна была б немагчымай без пастаяннай увагі, падтрымкі і ўсебаковай дапамогі Пятра Міронавіча – на Украіне, дзе раней за нас узяліся за выданьне аналагічнай

энцыклапедыі, за гэты час пасьпелі падрыхтаваць толькі няпоўныя тры тамы. Калі Броўку зваліла страшная хвароба, Машэраў ледзь ці не штодня наведваўся да яго ў палату падтрымаць маральна, рабіў усё магчымае, каб паказаць хворага паэта лепшым медыцынскім сьвяцілам, арганізоўваючы лячэньне ў элітарнай Крамлёўцы і Барвісе, знайсьці патрэбныя лякарствы за мяжой. Ня толькі мне кінулася ў вочы, як шчыра і як глыбока перажываў Пётр Міронавіч Броўкаву сьмерць, бы адчуваючы нешта падсьвядома-фатальнае асабістае. Ён сам паехаў на Усходнія могілкі, доўга хадзіў самотна, прыглядваючы найбольш прыдатнае для Броўкі месца, і загадаў капаць дол там, дзе канчаецца шырока-парадная цэнтральная алея, раздвойваючыся, разьбягаючыся пад вострым вуглом: хочашня хочаш, а завітаўшы на могілкі, ніяк не абмінеш Броўкаву магілу. А праз нейкія паўгоду зусім непадалёк, не даходзячы якіх-небудзь сто метраў, наканавана было легчы на свой вечны спакой і яму, Пятру Міронавічу...

У кабінеце Машэрава бывалі, бадай, усе вядомыя і ня надта вядомыя дзеячы літаратуры і мастацтва. Ён умеў слухаць і прыслухоўвацца да іхніх часам нязвыклых для вуха думак і ацэнак, унікаў у іхнія праблемы і патрэбы, стараўся, наколькі гэта было магчыма, дапамагчы ці падтрымаць. Дакладна ведаю, што без ягонай падтрымкі не пабачылі б сцэны многія, калі не большыня, актуальныя і сьмелыя па тым часе п’есы Андрэя Макаёнка. Дакладна ня маю сьведчаньняў, але ведаючы парадкі і норавы ўладных калідораў, ёсьць падставы меркаваць: без “маўчаньня”, “няведаньня”, “незавастрэньня ўвагі” Машэрава наўрад ці ўсе без выключэньня новыя аповесьці Васіля Быкава былі б апублікаваныя ў рэспубліцы. А гэта адкрывала ім шлях на саюзную і сусьветную арэну, а найперш дык спрыяла адоленьню цэнзурных бар’ераў і рагатак у Маскве. І яшчэ: вельмі сумняваюся, што абачлівы і асьцярожны АТК толькі па ўласнай ініцыятыве, бяз ведама Першага рашыўся інкогніта на сустрэчу з апальным Быкавым у Гародні – хто-хто, а ён выдатна ведаў, як працуюць людзі Нікулкіна... І думаю, ня без нейкім чынам удзелу Машэрава многія сацыяльна-вострыя, на мяжы фолу творы Пімена Панчанкі, маладзейшых Генадзя Бураўкіна, Анатоля Вярцінскага, іншых аўтараў не патрапілі ў разрад дысідэнцкіх і антысавецкіх. Пётр Міронавіч надзвычай рэўніва клапаціўся і дбаў пра высокі маральны аўтарытэт творчых людзей, глыбока перакананы, што пісьменьнік ў беларусаў, як і ва ўсіх славянаў, паняцьце значна большае, глыбейшае і шырэйшае, чым проста літаратар, спрыяў, каб яны мелі належныя ўмовы для сваёй творчай работы. Члены творчых Саюзаў мелі права на васемнаццаць квадратных метраў лішку жылой плошчы пад рабочы кабінет. Дый увогуле ніхто з творчых, таленавітых людзей надта не бяздомнічаў, не абіваўся па чужых кутках. Творчым Саюзам пастаянна выдзялялася жыльлё і па лініі гарвыканкаму, і з розных ведамасных фондаў. Па распараджэньні Машэрава каля дзесяці працэнтаў кватэраў у найбольш камфартабельных і прэстыжных дамах, якія будавала Кіраўніцтва справамі ЦК, выдзялялася дзеячам літаратуры і мастацтва – варта заглянуць у старыя, дый апошні даведнік Саюза пісьменьнікаў: колькі там хатніх адрасоў пазначана дамамі па вуліцы Пуліхава, Захарава, Маркса, Янкі Купалы, Кульман. Ці прайсьціся і паглядзець, колькі мемарыяльных дошак з імёнамі слынных дзеячоў культуры прымацавана на фасадах некалі самых прэстыжных цэкоўскіх дамоў. Пётр Міронавіч быў перакананы, што нашая беларуская літаратура, нашыя пісьменьнікі заслужылі мець свой сучасны і прасторны дом, дзе будуць па-хатняму зьбірацца, абмяркоўваць свае надзённыя праблемы, сустракацца з чытачамі, праводзіць творчыя вечары і г.д., лічыў сорамам кіраўніцтва рэспублікі, што яны яго ня маюць. Нягледзячы на маль неадольныя цяжкасьці з уключэньнем падобных аб’ектаў у план падрадна-будаўнічых работ, які фарміравала Масква, Машэраву з ягоным аўтарытэтам кандыдата ў члены Палітбюро ўдалося “зачапіцца”, пасьля чаго не даваў нікому спакою, ад падмурка

да ўстаноўкі вітражоў і абсталявання залаў, кабінетаў, трымаў будаўніцтва паасабліваму ўтульнага Дому літаратара ў цэнтры гораду пад сваім асабістым кантролем. Ён сам урачыста адкрыў пісьменьніцкі дом, уручыўшы кіраўніку Саюзу сімвалічны ключ на права вечнага карыстаньня, падмацаванае рашэньнем Саўміну аб бязвыплатнай перадачы аб'екту на баланс, чытай – у поўнае распараджэньне і ўласнасьць Саюзу пісьменьнікаў... І, пэўна, у труне перавярнуўся Пётр Міронавіч ад прыкрасьці і сораму, калі сёньняшні гаспадар ягонага кабінету бесцырымонна, адным росчаркам усемагутнага пяра забраў у пісьменьнікаў іхні Дом ды яшчэ і змусіў плаціць непасільную арэнду свайму Кіраўніцтву справамі, каб праз нейкі час былых гаспадароў разам з унікальнай бібліятэкай, архівамі, дзе захоўваюцца асабовыя справы ўсіх класікаў нашай літаратуры, пачынаючы з Купалы і Коласа, іншымі дзелавымі паперамі і дакументамі, многія з якіх мелі значную гістарычную вартасьць, выкінуць на вуліцу ў літаральным сэнсе, засяліўшы вызваленыя плошчы камерцыйнымі структурамі, якія спраўна плоцяць даніну Кіраўніцтву справамі... Падобнай цынічнай экспрапрыяцыі ўласнасьці грамадскай творчай арганізацыі не адбылося ні ў адной постсавецкай рэспубліцы...

Але вернемся да АТК. На сёньняшні розум, дык нават дзіўна, што гэты, здавалася, дэнацыялізаваны, без хоць якога-кольвек адчування сваіх нацыянальных каранёў чалавек раптам пранікся павагай і любоўю да беларускай літаратуры, культуры і ейных творцаў. Ці ягоная рускасьць была паказной, каньюктурнай, ці павага і любоў не да канца шчырымі, ці... Ён быў чалавек разумны, цёрты наменклатурны калач з вострым палітычным чуцьцём і ўменьнем трымаць нос па ветры, і ня мог не разумець, што ў галоўнага ідэолага проста няма іншай альтэрнатывы, як сьледаваць прыкладу Першага. Ведаць бы, што было тады прадметам і прычынай іхніх бурных і нярвовых спрэчак-сутычак!..

Пасьля сьмерці Машэрава АТК цяжка было хаваць, што пачувае сябе даволі няўтульна, дыскамфортна. Падобна, ён разгубіўся, страціўшы звыклыя арыенціры і стрыжань, стаў кідацца ў крайнасьці, дапускаць недаравальныя для яго памылкі. Як выступленьне перад партактывам з першай адкрытай, публічнай крытыкай Машэрава за перабольшаньне ролі партызанскага руху і прыніжэньне ролі Чырвонай арміі ў вызваленьні Беларусі. Канечне, было тое перабольшаньне, але час для крытыкі выбраў абсалютна непрыдатны – яшчэ ня ўлёгся боль страты, а Пётр Міронавіч і пасьля сьмерці працягваў заставацца і ў народзе, і ў партактыву абсалютным аўтарытэтам, таму крытыка была ўспрынятая з недаўменьнем і прыкрасьцю, а бестактны выпад былога паплечніка расцэнены як спроба дагадзіць, выслужыцца перад новым Першым, які ня меў дачыненьня да партызанкі. Асабліва прыкрым было гэтае выступленьне для тых, хто прымаў удзел ці ведаў аб падрыхтоўцы вялікага артыкулу з асэнсаваньнем і ацэнкай партызанскага руху на Беларусі, суаўтарамі якога выступалі Машэраў і Кузьмін. Недзе за месяцы два да трагедыі АТК даваў мне гэты больш чым на восемдзесят старонак машынапісу тэкст з просьбай прайсьціся па стылю, што я і зрабіў найдобрасумленьнейшым чынам. Матэрыял падаўся мне надзвычай цікавым – доказным, пераканаўчым, з мноствам невядомых фактаў. Шкада, што ён так і застаўся неапублікаваным. І вельмі сумняваюся, што абачлівы АТК пастараўся, каб артыкул патрапіў у партыйны ці дзяржаўны архіў. Але калі і насамрэч рукапісы не гараць, то яшчэ можна спадзявацца... Думаю, гэта было б калі не сенсацыйнай, то вельмі цікавай знаходкай...

Калі АТК бываў у добрым настроі, іншы раз яму проста карцела расказаць, мо трошачкі пахваліцца, які ён мудры і тонкі псіхолаг, апаратны гулец экстракласу. Мусіць, з гадамі ў кожнага зьяўляецца такая патрэба, асабліва ў тых, хто з-за сваіх высокіх пасадаў застаюцца абдзеленымі шчырымі сяброўскімі

стасункамі. Канечне ж, было б найвялікшым нахабствам сьцьвярджаць, што я быў на кароткай назе з АТК, але, як ужо казаў, сам ня ведаю чаму ён заўсёды ставіўся да мяне прыязна, яму падабалася разважліва, неназойліва, з намёкамі, паўнамёкамі даваць мне, маладому, урокі мудрасьці, часьцей за ўсё на прыкладзе свайго багатага жыцьцёвага вопыту, падміргваючы: маўляў, глядзі-назірай пісьменьніцкім вокам, матай на вус – мо спатрэбіцца... Калі не для сябе, то для новай аповесьці ці раману... Насуперак усялякай службовай этыцы ён з хітраватай усьмешачкай прыадкрыў заслону на тайную паддывановую гульню загадчыкаў аддзелаў прапаганды і агітацыі Паўлава і культуры Антановіча, якія навыперадкі, вылузваючыся са скуры, ірвуцца на ягонае пакуль што занятае сакратарскае месца. На маё бясслоўна-запытальнае зьдзіўленьне ўсьміхнуўся, нясьпешна ўзяў чарговую цыгарэту, машынальна прапанаваўшы і мне, хоць ведаў, што ў ягоным і без таго пракураным пакоі адпачынку ды яшчэ ў ягонай прысутнасьці паліць ніколі сабе я не дазваляю, зьняў акуляры паглядзеў з характэрным доўгім задуменна-гарэзьлівым прыжмурам, пстрыкнуў колькі раз запальнічкай, не прыкурваючы, сказаў, здаецца, больш сабе, чым для мяне:

– Самае цікавае – ні аднаму з іх нічога ня сьвеціць. Не разумеюць, дурні... – І на працяг майго бясслоўнага зьдзіўленага пытаньня з хітрынкай патлумачыў: – Па-першае, я сам пакуль што сыходзіць не зьбіраюся. А па-другое... Па-другое... А ты сам прыгледзься ды пакумекай, чаму...

У калідорах і кабінетах на чацьвертым паверсе цэнтральнага корпусу, дзе размяшчаліся ўсе тры ідэалагічныя аддзелы, канечне ж, вяліся шэпты аб магчымых пераемніках АТК – узрост ёсьць узрост, нікуды не падзенешся. Лагічна было, што ў крэсла галоўнага ідэолага, як і калісь АТК, павінен перасесьці загадчык галоўнага ідэалагічнага аддзелу Паўлаў. На першы погляд, ён меў усе падставы для вылучэньня – і ўзрост, і дзелавыя якасьці з багатым службовым вопытам, і насамрэч жалезную арганізатарскую хватку, і ўменьне на высокім узроўні падрыхтаваць любы дакумент, за што яго высока цанілі Машэраў, а потым Кісялёў, і прэстыжнае вучонае званьне кандыдата навук з падыходам доктарскай дысертацыі, і членства ў Саюзах журналістаў, пісьменьнікаў, шматлікія публікацыі і кнігі. Праўда, вялікім мінусам быў ягоны характар, з якім, па словах АТК, у кабінеце галоўнага ідэолага той будзе паводзіць, як слон у лаўцы з посудам. І яшчэ: пэўна, каб выслужыцца і паспрыяць кар’еры, у анкеце той запісаў сябе рускім, хоць, здаецца, жменька стараверaў на Браслаўшчыне, з якіх паходзіў Паўлаў, за столькі стагоддзяў, тым больш пры атэістычным сацыялізме даўно растварылася ў мясцовым насельніцтве. Дый справа павярнулася так, што Масква пачала сачыць і негалосна патрабаваць, каб на пасадзе галоўнага ідэолага ў саюзных рэспубліках быў прадстаўнік карэннай нацыянальнасьці. Канечне, пры жаданьні таго ж Машэрава ці потым Кісялёва, Сьлюнькова гэтае патрабаваньне можна і абыйсьці, але ці будзе тое жаданьне?.. Загадчык другога па значэньні ідэалагічнага аддзелу – навукі і навуковых установаў Юры Смірноў доўгія гады працаваў памочнікам у Машэрава, падобна, прытаміўся і ў знак удзячнасьці за добрасумленную працу атрымаў гэты аддзел, і ні па ўзросту, ні па вопыце работы, ні па нейкіх іншых якасьцях у патэнцыяльныя прэтэндэнты нават не каціраваўся. Затое значна маладзейшы за сваіх калегаў надзвычай амбітны загадчык аддзелу культуры Іван Антановіч быў абсалютна рэальным і найбольш верагодным пераемнікам АТК. Хоць ён і блізка ня меў такога паслужнога сьпісу на ідэалагічных пасадах, такога вопыту і хваткі, як у Паўлава, але быў прадстаўніком так званай новай наменклатурнай эліты – з вучоным званьнем доктара філасофскіх навук, прафесара, дасканалым валоданьнем замежнымі мовамі, вопытам, у тым ліку дыпламатычнай, працы за мяжой. Аднак нягледзячы на сваю вучонасьць, ён быў чалавек надзвычай саманадзейны, самаўлюбёны, на поўным сур’ёзе лічыў сябе вялікім стратэгам

і дыпламатам, здольным бачыць і прадбачыць разьвіцьцё падзеяў, дакладна пралічваць кожнае сваё дзейства, кожны свой хітры крок як мінімум на пяць хадоў наперад. Аднак усе ягоныя хітрыя хады тут жа распазнаваліся нават маладасьведчанымі, маласпрактыкаванымі у кулуарна-закулісных гульнях дылетантамі. З яго аж перлі кар'ерныя памкненьні, і АТК з хітравата-паблажлівай усьмешачкай назіраў за ягоным местачковым інтрыганствам, іхняй з Паўлавым дробнай валтузьнёй-варажнечай, то падліваючы неўпрыкмет масла ў агонь, сутыкаючы ілбамі, то вялікадушна разводзячы, патрабуючы ад іх міру і згоды між сабой. Вялікі хітраван добра ведаў: пакуль прэтэндэнты варагуюць, гатовыя ў любы момант учапіцца адзін аднаму ў горла – яны ў ягоных руках, і бліскуча перайграў, абвёў вакол пальца абодвух: рэальнага і небясьпечнага прэтэндэнта сплавіў падалей у Маскву на заштатную пасаду прарэктара Акадэміі грамадскіх навук... Паўлаў жа перасядзеў АТК, так і не дачакаўшыся запаветнага кабінету на пятым паверсе, закончыў сваю кар'еру на пасадзе апошняга рэктара мясцовай ВПШ. А Антановіч усё ж зьдзейсьніў сваю блакітную мару – колькі часу пабыў ня проста, а другім сакратаром аперэтачнай Расейскай кампартыі на чале з адыёзным Палазковым. Пасьля правалу ГКЧП і разгону кампартыяў ці не бальшыня нашых землякоўпартфункцыянераў, застаўшыся ў Маскве без пасадаў і іншай сінекуры, як птахі з выраю, пацягнуліся на малую незалежную радзіму, дзе сустракалі іх надзвычай цёпла і гасьцінна, ледзь ці не імгненна ўладкоўваючы на ўплывовыя і грашавітыя пасады. Сярод гэтых, так сказаць, рэпатрыянтаў, канечне ж, не магло ня быць і Івана Антановіча, які ў адрозьненьне ад пераважнай большасьці валодаў ня толькі замежнымі еўрапейскімі, але і роднай беларускай мовай, якая стала дзяржаўнай і магла вельмі і вельмі спатрэбіцца... Антановіча паклікалі пад сьцягі тагачаснага прэм'ера Кебіча, пад якога наменклатура зварганіла канстытуцыю і рыхтавала ў прэзідэнты ледзь ці ня з царскімі паўнамоцтвамі. Іван Іванавіч з найвялікшым імпэтам узяўся за справу і неўзабаве зрабіўся самым актыўным, самым наступальна-агрэсіўным членам Кебічаўскай перадвыбарнай каманды, ейным стратэгам, тактыкам і агітацыйным рупарам. Штодня з ранку да ночы па тэлебачаньні, радыё, у газетах, на мітынгах і сустрэчах з выбаршчыкамі ён скарыстоўваў усё сваё красамоўства, даказваючы, які мудрэц і прафесіянал ягоны патрон і якія дылетанты, нікчэмнасьці ўсе іншыя прэтэндэнты на прэзідэнцкае крэсла. Кебіч бліскуча прайграў, тым ня менш ягоны верны рупар неўзабаве ўпісаўся ў сьвіту пераможцы, атрымаў выдатную магчымасьць праявіць свае дыпламатычныя таленты на высокай пасадзе міністра замежных справаў, аднак умудрыўся перахітрыць нават самога сябе, словам, наламаў дроў, і гаспадару нічога не заставалася, як выдаліць яго з дыпламатычнага ведамства...

Цяжка было не заўважаць, што пасьля Машэрава АТК неяк зьвяў, здаў нават зьнешне, стаў губляць ранейшую ўпэўненасьць, падстрахоўвацца, неахвотна браць на сябе рашэньне неадназначных пытаньняў. Праз нейкі час ён знайшоў паразуменьне з пераемнікам Машэрава Кісялёвым, акрыяў духам, але ненадоўга. Ціхан Якаўлевіч намерыўся памяняць галоўнага ідэолага. Ягоная адстаўка ў сувязі з выхадам на пенсію была абгавораная на сакратарыяце, узгодненая з Масквой. Але Ціхан Якаўлевіч з-за невылечнай хваробы неўзабаве адыйшоў, а прысланаму з Масквы новаму гаспадару рэспублікі Сьлюнькову, адразу ж празванаму дырэктарам ЦК, было не да ідэалогіі. Сьлюнькоў прыгадвае, што АТК быў першы з сакратароў ЦК, хто прыйшоў да яго, расказаў пра прынятае вуснае рашэньне і папытаў, што яму рабіць. Калі верыць Сьлюнькову, ён нічога не адказаў, прыкінуўшы, што зараз да гэтага ў яго ня дойдуць рукі, праз колькі дзён сустрэўся з Васілём Быкавым, каб пачуць ягонае меркаваньне пра стан ідэалогіі ўвогуле і праблемы творчай інтэлігенцыі ў прыватнасьці. Васіль Уладзіміравіч сказаў, што праблемаў хапае, але ня стаў пра іх гаварыць, заявіўшы: калі параўнаць з тым,

што робіцца ў іншых рэспубліках, то можна лічыць, што ў нас іх няма, і вельмі пахваліў Кузьміна. Паклікаў АТК і сказаў: забудзьце пра тое рашэньне, працуйце... Але няўмольны час дыктаваў новыя ўмовы, патрабаваў сьвежыя падыходы, іншых выканаўцаў – пачыналася заранiца Гарбачоўскай перабудовы. АТК ня быў закасцянелым дагматыкам і кансерватарам, а хутчэй разумным і спакойным рэфарматарам, аднак дынамічная сацыяльная рэальнасьць ледзь ці не штодня стала высоўваць нязвыклыя праблемы, вытыркаць рэчы, пераступіць праз якія ён ня мог, ня выракшыся таго галоўнага, чаму служыў усё сваё жыцьцё. Праз колькі год зноў узьнікла пытаньне аб ягонай замене, ва ўсякім разе на ўзроўні другога сакратара ЦК Генадзя Барташэвіча, які вёў кадры. Наноў было ўзгоднена з Масквой, а пераемнікам яму быў названы, карыстаючыся фармуліроўкамі Барташэвіча, старшыня Дзяржтэлерадыё – малады, але вопытны, умелы, чуйны да новых праблемаў, здольны прымаць сьмелыя, адэкватныя выкліку часу рашэньні, аўтарытэтны ня толькі сярод навуковай і творчай інтэлігенцыі, але і ўсяго ідэалагічнага актыву рэспублікі, вядомы ня толькі ў Беларусі, а і ва ўсім Саюзе і за мяжой паэт Генадзь Бураўкін. І хоць гэтая кандыдатура не зусім падыходзіла пад патрабаваньні Слюнькова: на ўсе ідэалагічныя пасады ад сакратара да інструктара партыйных камітэтаў прызначаць толькі людзей, якія прайшлі загартоўку і школу на пасадах начальнікаў цэхаў, зьменаў, брыгадаў на прамысловых прадпрыемствах альбо брыгадзіраў, загадчыкаў жывёлагадоўчых фермаў і комплексаў у калгасах і саўгасах, аднак Барташэвіч быў упэўнены, што той ня будзе пярэчыць супраць узгодненай у Маскве кандыдатуры Бураўкіна. Канечне ж, ні я, ні Генадзь пра тое нічога ня ведалі, хоць і даходзілі нейкія чуткі, але ўсё гэта падавалася на той час малаверагодным і амаль нерэальным. І ў Генадзя былі зусім іншыя планы і памкненьні – ён ссумаваўся па ўласнай творчасьці, на якую проста не хапала часу, прагнуў перабрацца на спакайнейшае месца, займець магчымасьць не прыхапкам, а грунтоўна заняцца рэалізацыяй нязьдзейсьненых за гэтыя гады творчых задумак. Ён быў ужо згодзен перайсьці на работу ў Саюз пісьменьнікаў, яшчэ нядаўна зьняўшы сваю кандыдатуру з абмеркаваньня, аднак АТК рашуча заявіў: і ня думай – ты мне патрэбен на тэлерадыё... Калі праз нейкі час у кабінет да Бураўкіна нечакана заявіўся Барташэвіч з інсьпектарам ЦК КПСС па Беларусі і Прыбалтыцы, Генадзю і ў галаву не прыйшло, што гэта агледзіны, і паводзіў сябе перад высокім маскоўскім госьцем абсалютна натуральна і раскавана, гаварыў без усялякай аглядкі, ад чаго Барташэвіч аж круціўся ў крэсьле, утыркаўся ў гаворку, намагаўся неяк згладжваць вострыя вуглы. А потым пазваніў задаволены і паведаміў і пра мэту візіту маскоўскага чыноўніка, і тое, што таму вельмі спадабалася і шчырая, вострая гаворка, і Генадзева кандыдатура, пра што і зробіць заключэньне свайму начальству. А затым АТК паклікалі ў Маскву, выразна намякнулі і спыталі, каго бачыць сваім пераемнікам. Адказаў, што не гатовы назваць адразу, папрасіў час падумаць. Яму назвалі кандытатуру Бураўкіна, і АТК як толькі мог стаў хваліць яго, у канцы зрабіўшы выразную заміначку: ёсьць адзін недахоп – заядлы беларускі нацыяналіст... Гэтага было дастаткова, каб пахаваць рэальнага суперніка. Я не хачу надта строга судзіць АТК – не ён адзін такім чынам падстаўляў падножкі супернікам, тады была, дый пэўна, жыве па сёньня гэтая звычайная практыка паддыванавых наменклатурных гульняў...

АТК, як і ягоны час, быў неадназначнай і супярэчлівай фігурай, са сваімі сьветлымі і цёмнымі адценкамі, сваімі плюсамі і мінусамі. Ён мог падняць на ногі ўсю медыцыну, апякаючы хворага Уладзіміра Караткевіча, ледзь ці не штодня наведваючы яго ў лечкамісіі, і адначасова пальцам не паварушыць, каб асадзіць Івана Антановіча, які з незвычайнай, як гэта той умеў, напорыстай дэмагогіяй, бесцырымоннай нахрапістасьцю выкручваў рукі членам камісіі па дзяржаўных

прэміях, каб уганараваць Дзяржаўнай прэміяй па літаратуры ня хворага Караткевіча, а іншага, асабіста блізкага да Антановіча літаратара. АТК бываў госьцем на кватэрах Васіля Быкава, Пімена Панчанкі, ад апошняга, усяго на год старэйшага, настойліва патрабаваў зьвяртацца да яго на ты, зваць проста па імені і адначасова заставацца ўбаку, староньнім назіральнікам, калі іхнія творы бязьлітасна калечыла цэнзура. Падобны сьпіс можна працягваць. Тым ня менш па вялікім рахунку, аб'ектыўна, у шырокай перспектыве ён пакінуў і добры сьлед, і добрую памяць у гісторыі нашай культуры. Ва ўсякім разе параўняцца з ім і блізка ня можа ніводзін з галоўных ідэолагаў ні да яго, ні пасьля яго...

За многія гады АТК не прывык і хвіліны бываць без справы, тлумных службовых клопатаў, таму, бадай, кожнаму кідалася ў вочы, наколькі балюча ён перажыве сваю бесцырымонную адстаўку, затаіўшы горкую крыўду і на Першага, і на сваіх былых калегаў, і немаведама яшчэ каго. Ён практычна перастаў заходзіць у ЦК, у адрозьненьне ад большыні былых партфункцыянераў высокага рангу зьняўся з ганаровага партуліку і перайшоў у домакіраўніцтва па месцы жыхарства. Каб мець нейкі занятак, засеў за правілы дарожнага руху, паступіўшы на курсы падрыхтоўкі вадзіцеляў, набыў уласнага "Жыгуля", каб не залежачы ад некага езьдзіць на рыбалку, па грыбы. Ён напрэч адыйшоў ад публічнай палітыкі, нейкай больш-менш актыўнай грамадскай дзейнасьці, нават у бурныя гады так званай перабудовы, хоць уважліва сачыў за ўсім, што дзеецца, намагаўся зразумець і не кідаўся ні на тыя, ні на іншыя барыкады. Ня ведаю, ці працягваў ён актыўныя кантакты з кім-небудзь з дзеячаў літаратуры і мастацтва. Пэўна, не... Хоць хто ж яго ведае... Прыгадваю, ці то з Германіі, ці ўжо з Прагі званіў мне Васіль Быкаў і папрасіў падказаць, калі ёсьць пад рукой, а калі няма – нейкім чынам знайсьці і падказаць яму новы тэлефон Кузьміна, меў намер пазваніць і павіншаваць таго з днём нараджэньня. Вельмі шкадую і дакараю сябе, што пасьля адстаўкі АТК я нават спробы не зрабіў выйсьці на кантакт з ім, адчуваючы нейкую ніякаватасьць і сумненьні ў тактоўнасьці напрошвацца на сустрэчу. Сустракаліся толькі зрэдку, выпадкова на вуліцы, а часьцей за ўсё на хаду ў час невясёлых разьвітальных жалобных мерапрыемстваў з агульнымі знаёмымі, пераважна цэкоўцамі і дзеячамі літаратуры і мастацтва. Апошні раз бачыліся на разьвітаньні з Арсенам Ваніцкім. Ён шчыра ўзрадаваўся, пабачыўшы разам калісь вельмі дружную нашу цэкоўскую тройцу – Сяргея Законьнікава, Алеся Жука і мяне. Пасьпелі пастаяць, пакурыць на вуліцы і заадно добра пагаварыць. Запомніліся ягоныя прачулыя словы: я вельмі рады, хлопцы, за вас, што трымаецеся адзін аднаго. І мой вам наказ і запавет: заўжды трымайцеся разам. Паадзіночку вас загоняць, скруцяць у бараньні рог...

Здаецца, ардынарная сентэнцыя, а не выходзіць з галавы, з гадамі набываючы ўсё глыбейшы і надзёньнейшы сэнс...

Уведаўшы, што яго зваліла невылечная хвароба і зараз знаходзіцца на лячэньні ў Бараўлянах, я пазваніў на кватэру: у якім корпусе і палаце яго шукаць, як пачуваецца, ці можна адведаць? На зьдзіўленьне і радасьць жонка Таісія Андрэеўна сказала:

– А я перадаю яму трубачку, сам раскажа...

Адчувалася, Аляксандр Трыфанавіч рады майму званку. Яго адпусьцілі на колькі дзён, зрабіўшы невялікі перапынак між цяжкімі сеансамі хіміятэрапіі. Ягоны глухаваты голас быў нязвыкла слабы, але гаварыў і гаварыў, жыва цікавячыся, што робіцца ў Саюзе пісьменьнікаў, што чутно з Прагі ад Быкава, ці мне пішацца, як там маюцца хлопцы, потым узбадзёраным голасам сказаў:

– Вельмі хацеў бы вас бачыць. Бяры Генадзя, Сяргея і заходзьце...

– А калі?..

– Ды хоць бы заўтра ці пасьлязаўтра... – Схамянуўся: – Хаця, не... Мяне па-

вінны забраць на тыдні два ў бальніцу. Во вярнуся... Сазвонімся і дамовімся...

– А калі мы наведаемся да вас у бальніцу?

Ён рашуча і катэгарычна адмёў такі варыянт: хочацца гаварыць з намі, трохі ачуняўшы ад цяжкіх працэдураў, бо гаворка маецца быць доўгай і нясьпешнай, бяз лішніх вушэй. І пасьля паўзы загадкава дадаў: ёсьць што прыгадаць, ёсьць што вам расказаць...

Насамрэч яму было што прыгадаць, было што расказаць, прыадчыніць, высвятліць нейкія важныя спружыны і таямніцы, мо нават споведдзю перад намі, маладзейшымі, зняць з душы камень, паспрабаваць апраўдацца, даць магчымасьць паўней зразумець, асэнсаваць і ягоны супярэчлівы час, і яго самога. На вялікі жаль не паспеў... Нібы знарок, нібы па нейкай дзіўнай іроніі лёсу свой апошні аэрадром, свой апошні зямны прытулак ён, ваенны штурман і дзяржаўны дзеяч, знайшоў на ганаровых Усходніх могілках па суседству і ў акружэньні слынных людзей навукі, літаратуры і мастацтва, сяго-таго з якіх ён калі і ня надта любіў, то паважаў, і яны яму плацілі тым жа. Побач зьлева аказаўся легендарны пясьняр Уладзімір Мулявін, непадалёк у суседніх радах Кандрат Крапіва, Уладзімір Караткевіч, Пімен Панчанка, Іван Чыгрынаў, Барыс Сачанка, а праз нейкіх паўгоду побач, па суседству, справа лёг Васіль Быкаў, затым трошкі далей – Іван Шамякін...

Напачатку нашыя службовыя стасункі з Паўлавым складваліся як нельга лепш. З першага ж дня ён ставіўся да мяне з падкрэсьленай увагай і павагай. Мо таму, што я прыйшоў, можна сказаць, з гушчы жыцьця і з даволі саліднай пасады ў абкаме партыі, дзе меў добрую рэпутацыю і рэальную персьпектыву росту. Добраму стаўленьню, вядома ж, спрыяла, што ў мяне было веданьне ідэалагічнай работы ва ўсёй шырыні ейнага дыяпазону і сістэмы тэле-радыё, што дазволіла амаль адразу ўвайсьці ў курс справы. Канечне ж, і тое, што ўжо было сякое-такое літаратурнае імя, да чаго ён ставіўся паважна, паколькі сам займаўся нялёгкім літаратурным рамяством, намерваючыся стаць паўнацэнным членам Саюзу пісьменьнікаў. Але, бадай, самае галоўнае – умеў даволі прафесійна і гладка выдаваць на гара розныя простыя і аналітычныя даведкі, устаўкі ў даклады і пастановы з ацэнкамі, указаньнямі, канкрэтнымі прапановамі, разьдзелы і цалкам усемагчымыя мерапрыемствы, якія складаліся ледзь ці не штодня, ледзь ці не на кожны чых Генеральнага сакратара, кожную чарговую пастанову ЦК КПСС. І вядома ж, што мог віртуёзна адпісвацца, сьпісваць ў архіў лісты і пасланьні заведамых паклёпнікаў, хворых на галаву людзей, складаць даведкі і здымаць з кантролю раней прынятыя дакументы, мерапрыемствы, за чым надзвычай пільна сачыў усемагутны Агульны аддзел. Усё гэта было найпершым і найвышэйшым паказчыкам прафесіяналізму работніка аддзелу прапаганды і агітацыі. У абкаме я добра набіў руку на гэткага кшталту пісаніне, гэтая фармалістыка давалася тады на дзіва лёгка, тварыў і выдаваў яе часам сьмяючыся, амаль экспромтам, і неўзабаве Паўлаў так паверыў у мае здольнасьці, што стаў візіраваць ці падпісваць, зірнуўшы збольшага па дыяганалі альбо і ўвогуле не чытаючы. Адольваць жа з першага заходу строгае Паўклаўскае сіта, ды яшчэ з непакрэсьленым ягоным размашыстым почыркам чорным (іншага ён не прызнаваў) атрамантам арыгіналам лічылася вышэйшым пілатажам, падымала ў вачах калегаў. А мне вельмі імпанавала яго дзелавітасьць і рашучасьць, ягоная тонкая інтуіцыя і жалезная хватка, востры нюх, здольнасьць з паўслова ўнікнуць у сутнасьць праблемы, імгненна прыняць рашэньне, часам нестандартна-сьмелае, нават рызыкоўнае, але амаль заўсёды не дурное. З ім можна было спрачацца, і калі меліся нейкія сур'ёзныя аргументы, Паўлаву хапала розуму ня кідацца ў амбіцыю, як гэта рабілі многія: я начальнік – ты дурань, а спакойна адступаць ад

свайго ранейшага меркаваньня ці рашэньня. Але калі ў нечым быў упэўнены, перакананы, калі нешта ўспрымалася ім апрыёры, ісьцінай у апошняй інстанцыі, гнуў сваю лінію напорыста, бескампрамісна і да канца, нават калі гэтая ісьціна ў грамадскай сьвядомасьці пачынала ўспрымацца як не бездакорная, мо нават сумніўная. У яго, у прыватнасьці, была літаральна алергія, нейкі пункцік на беларускі нацыяналізм, які ён чамусьці атаясамляў з любымі праявамі нацыянальных пачуцьцяў, нацыянальнага жыцьця і перш за ўсё – з нацыянальнай мовай. Ягонае дзіўнае, прымітыўна-спрошчанае разуменьне інтарнацыяналізму кінулася ў вочы адразу, як прыйшоў на работу ў аддзел, і пасьля некалькіх спробаў лёгка і дыпламатычна запярэчыць усур'ёз, са спасылкамі на класікаў марксізму-ленінізму падыскутаваць з ім на гэтую тэму выразна адчуў, што нашым добрым, прыязным службовым і ня толькі службовым стасункам наканаваны нядоўгі век. Асабліва пасьля таго, як ён неўзабаве выклаў свой погляд на моўную палітыку і практыку ў тэле і радыёвяшчаньні, якой неабходна строга прытрымлівацца: усе сацыяльна-палітычныя, маладзёжныя, дзіцячыя, спартыўныя, на прамысловыя і з жыцьця рабочага класу перадачы павінны рабіцца і весьціся толькі па-руску, а па-беларуску і ў зьмешаным варыяньце – інфармацыйныя выпускі, літаратурна-драматычныя і тэкставыя музычныя. Далікатна, але цьвёрда запярэчыў яму: ні адным афіцыйным партыйным дакументам нічога падобнага ніколі не рэгламентавалася і не ўзаконьвалася. Ён паглядзеў на мяне даволі дружалюбна і сказаў: мы самі будзем рэгламентаваць і ўзаконьваць, у адпаведнасьці з практыкай і... пажаданьнямі тэлеглядачоў і радыёслухачоў. Хіхікнуў і дадаў павучальна: з рускай мовай ніколі не перагнеш, а з гэтай беларускай трэба глядзець ды глядзець у два вокі...

Ды не для таго я сюды ішоў, каб сьлепа, пад казырок выконваць яго самадзейныя выдумкі і завіхрэньні па дратаваньні і без таго ўдратаваных астаткаў беларускасьці. Калі зусім шчыра, то і згадзіўся на гэтую пасаду, каб разам з Генадзем Бураўкіным рабіць беларускае радыё і тэлебачаньне нацыянальнымі, беларускімі, тым больш, што на гэты конт у мяне быў добры абкамаўскі вопыт па амаль поўнай беларусізацыі гарадзенскіх абласных тэле і радыёперадачаў. У мяне накапілася процьма праблемаў і прэтэнзіяў да рэспубліканскага тэлебачаньня і радыё, сярод якіх і незразумелы, дзіўны падыход: мясцовыя перадачы ў Гародні спрэс вядуцца па-беларуску, а выхады на Менск патрабуюць толькі па-руску, быццам бы ўжо гэта і не беларуская сталіца. Во цяпер будзе магчымасьць паставіць усё на сваё месца...

Але і недаацэньваць Паўлава, донкіхотнічаць, лезьці ўлабавую на ражон гэтаксама было б вялікім глупствам, шкодзіла б справе. Абгаварылі з Генадзем, выпрацавалі стратэгію і тактыку нашых паводзінаў. У прыватнасьці: калі Паўлаў пачне браць мяне за горла – буду спасылацца на Бураўкіна: маўляў, гэта ягоная ініцыятыва, ён не палічыў патрэбным узгадняць яе ні са мною, ні з ім, паколькі дэталёва абгаварыў усё з Машэравым... Удакладняць, высьвятляць ня тое што ў Машэрава, а нават у самога Генадзя, выдатна ведаючы, чыя ён крэаэтура і з чыёй ласкі насуперак ягонай волі прыйшоў на гэтую пасаду, мацёры кабінетны воўк Паўлаў нізашто і ніколі не асьмеліцца... Нашыя хітрыкі давалі плён. Сьцяўшы зубы, Паўлаў моўчкі мірыўся з паступовай, крок за крокам беларусізацыяй усіх без выключэньня накірункаў вяшчаньня, публічна не выказваючы сваёй незадаволенасьці, але, адчувалася, усё больш і больш расчароўваючыся ва мне. Першы раз, здаецца, адкрыта, непрыязна наляцеў каршуном пасьля выхаду ў лепшы вячэрні час цыклавой тэлеперадачы “Роднае слова”: ты куды глядзіш?! Што там робіцца?! Што, у гэткі час нельга паставіць нічога больш вартага?!. Я адбіўся даволі спакойна, спаслаўшыся на ўступнае слова патрыярха нашай літаратуры і навукі Кандрата Кандратавіча Крапівы, які вельмі высока ацаніў актуальнасьць

і карысьць пачынаньня тэлевізійнікаў. З Кандратам Кандратавічам Паўлаў ня стаў упадаць у спрэчку, а мне загадаў штодня падрабязна дакладваць яму пра ўсё, што робіцца і што мае рабіцца ў тэлерадыёкамітэце. Ніякага сакрэту ў тым не было, і я рэгулярна заходзіў і расказваў яму пра вырашаныя і нявырашаныя праблемы, захады, якія прымаюцца па павышэньні ідэйнага і літаратурна-мастацкага ўзроўню, тэхнічнай якасьці вяшчаньня, усталяваньні патрабавальнасьці і адказнасьці, творчай атмасферы ў калектывах, пра падрыхтоўку новых цыклавых перадачаў. Ён слухаў дзе ўважліва, дзе ўпаўвуха, дзе ўвогуле сумаваў, адчувалася, яго больш цікавіць інфармацыя зусім іншага кшталту, пачынаў пераможна падкідваць нейкія невядомыя мне сумніўнага характару факты, патрабуючы праверыць ці пераправерыць і зрабіць афіцыйнае заключэньне. Для мяне было пытаньнем: адкуль гэта ў яго? Па лініі КДБ ці ад уласных сексотаў, якіх, казалі, мае ва ўсіх рэдакцыях, падведамасных арганізацыях і ўстановах? Натуральна, узьнікла патрэба сустрэцца і пазнаёміцца з аператыўным супрацоўнікам КДБ Валерам Саўчуком, які займаўся Дзяржтэлерадыё. Гэта быў сімпатычны, разумны і вельмі прыстойны хлопец, з якім мы адразу ж знайшлі паразуменьне і агульную мову – у прамым і пераносным сэньсе. Праз некаторы час ён атрымаў павышэньне – узначаліў свой аддзел, які курыраваў ня толькі тэлерадыё, а і ўсе сродкі масавай інфармацыі, таксама творчыя саюзы. А нам вельмі пашчасьціла, што на гэтым месце аказаўся сумленны чалавек. Як і тое, што памочнікам у Генадзя быў былы баявы разьведчык, падпалкоўнік КДБ, а чэкісты, як вядома, ніколі не бываюць у адстаўцы, Мікалай Гаўрылавіч Братушэнка – крыштальна сумленны і прыстойны чалавек, які ня проста падзяляў нашыя погляды і ўсё, што мы рабілі, але ў некаторых сітуацыях быў і сапраўдным нашым, а найперш Генадзевым анёлам-ахоўнікам... Нядаўна прачытаў мемуары аднаго вядомага літаратара. Калі верыць чорным па белым напісанаму, то выходзіць быў толькі адзін чалавек, які па-сапраўднаму дбаў пра беларускасьць, змагаўся за яе ўадзіночку, калі ўсе вакол, нават блізкія сябры не разумелі, заміналі, часам шкодзілі яму і, натуральна, ягонай тытанічнай місіі, ускладзенай на яго самой Гісторыяй, і тым ня менш ён выцягнуў на сваім гарбе ўсё нацыянальнае адраджэньне. Канечне ж, гэты волат, абранец Божы і ёсьць любімы аўтарам галоўны герой мемуараў. Дзіву даешся, як ён не надарваўся... Жарт жартам, але па вялікім рахунку часам непрыкметныя, без аніякіх прэтэнзіяўна гістарычную місію людзі кшталту таго ж Саўчука, Братушэнкі ці затурканых жанчынак-настаўніц роднай мовы непрыкметна, ціха, спакойна і самааддана рабілі для нацыянальнага адраджэньня ня менш, чым некаторыя пратэндэнты на ролю нацыянальных волатаў і месіяў...

Паўлаў, здаецца, усімі фібрамі душы ненавідзеў Бураўкіна, і на тое, пэўна, былі падставы. Генадзь для яго быў непапраўны, закаранелы нацыяналіст, можна сказаць, закляты ідэйны вораг, які заўсёды абыходзіў яго на паваротах. Непрыязь да незалежнага і пасьпяховага Бураўкіна ў ім жыла даўно, і сам дакладна ня ведаў, з якіх часоў. Раздражнялі і ягоныя шматлікія артыкулы ў “Правде” па праблемах ідэалогіі, культуры, гісторыі, і тое, што патрапіў прадстаўляць гэтую найсаліднейшую партыйную газету ў Беларусі з падтрымкі і пратэкцыі Машэрава. Саўка ніяк ня мог зразумець, як здолеў, на ягоную думку, чалавек з сумніўным сьветапоглядам уцерціся ў давер, гэтак ачмурыць вопытнага і мудрага Машэрава. Ды не аднаго Машэрава! Яму дазваляецца выходзіць напрамую і вырашаць пытаньні ў Аксёнава, Кузьміна, ня кажучы пра Кісялёва і ягоных намесьнікаў. Цераз ягоную, Паўлава, галаву, без усялякага ўзгадненьня і прапрацоўкі на ягоным узроўні. Па маіх назіраньнях нялюбоў Паўлава да Бураўкіна дзіўным чынам ужывалася з паважным стаўленьнем да яго і яшчэ, здаецца, таемнай зайздрасьцю

ва ўсім – і ягонаму таленту, і ягонай рэспубліканскай і саюзнай вядомасьці, і ягонай камунікабельнасьці, абаяльнасьці, уменьню сыходзіцца з людзьмі, і ягонай імгненнай рэакцыі, у любой сітуацыі ня лезьці ў кішэню па слова. Паўлаў не адважваўся канфліктаваць, брацца ў рожкі з ім адкрыта, пэўна, асьцерагаўся ня толькі чарговы раз нарвацца на высокае заступніцтва, але і вострага Генадзевага языка, здольнага асадзіць, выставіць на сьмех каго хочаш. Таму, наступіўшы на горла ўласнай песьні, змушаў сябе па-прыяцельску зычліва, нават ліслíва ўсьміхацца Бураўкіну, спадзеючыся, што будзе сьвята і на ягонай вуліцы, ды ўсё часьцей і часьцей зрываючы сваю прыкрасьць і злосьць на мне. Нашыя добрыя службовыя стасункі неўзабаве сталі зусім псавацца. Пераканаўшыся, што патрэбнай інфармацыі, ці папросту кажучы кампрамату на Бураўкіна, ад мяне не дачакаецца, больш таго – пастаянна абвяргаю альбо зводжу на аніштo даносы ягоных сексотаў, Паўлаў дачакаўся зручнага моманту і вырашыў, самы час адкрываць па мне агонь на паражэньне – яму патрэбны быў на гэтай пасадзе зусім іншы, свой чалавек...

Калі гаварыць аб'ектыўна і па вялікім рахунку, то Бог насамрэч не абдзяліў Паўлава вострым розумам, арганізатарскімі здольнасьцямі, публіцыстычным талентам, што прадвызначала яму сьветлую будучыню, добрыя справы, людскую ўдзячнасьць і доўгую памяць. Ды, мусіць, пры гэтай дзяльбе не драмаў і чорт, неўпрыкмет падсунуўшы невыносна-цяжкі характар, з якім няпроста будзе рэалізаваць Богам задуманае. Пэўна, усё жыцьцё, ва ўсякім разе наколькі мог назіраць за ім у час сумеснай работы ў ЦК, ён змагаўся са сваім характарам, рабіў адчайныя спробы ўтаймаваць, зацугляць, узяць пад кантроль грубую, злую, чорную сілу, што расьпірала, рвалася з яго. Аднак яна была непадуладная ягонаму розуму, ягоным добрым памкненьням. Іншы раз неймавернымі высілкамі волі і з дапамогай супакаяльных пілюляў яму ўдавалася браць сябе ў рукі, але толькі на нейкі час, ненадоўга – натура ва ўсёй сваёй нядобрай, злой праяве няўмольна рвалася, вылузвалася наверх, прагнучы наталеньня новай энергіяй... Яна, натура, насамрэч нагадвала садыстку, вампірку, якая пастаянна патрабуе ахвяры, псіхічнай падзарадкі, без чаго пачувае сябе дужа няўтульна, дыскамфортна, хваравіта. У аддзеле пастаянна быў нехта ў ролі Паўлаўскай ахвяры, казла адпушчэньня, над кім ён літаральна зьдзекваўся, і чым ямчэй, балючай удавалася абразіць, растаптаць маральна, прынізіць, зьніштожыць чалавека, тым, адчувалася, ён большую асалоду меў. Гэтыя ахвярапрынашэньні сабе самому рабіліся, звычайна, публічна, для чаго склікаў да сябе ў кабінет усіх, хто быў на месцы, і працягваліся з дня ў дзень, аж пакуль не дауламваў, не дабіваў некага, робячы кар'ерны крывапуск, альбо вярбуючы сабе ў сексоты, ці не выбіраў сьвежую ахвяру... На маёй памяці ў аддзеле ягонымі ахвярамі, казламі адпушчэньня, хлопчыкамі для біцьця былі Коля Шоба, Слава Некрашэвіч, Мікола Жылінскі, Мікола Зяньковіч, Генадзь Анціпаў, Васіль Каленчыц, Генадзь Суднік, Віктар Крукоўскі дый іншыя. А трохі раней дык больш за ўсіх Міхась Парахневіч. Не было ў Паўлава ні літасьці, ні элементарнага такту, калі таптаў у гразь, еў поедам, даводзячы да сьлёз мілую і дабрэйшай душы Людмілу Севасьцьянчык, бязрукага інваліда Віктара Кіселя. Канечне, ва ўсіх іх можна было знайсьці нейкія недахопы, прамашкі ў рабоце, але гэта былі пераважна разумныя, прыстойныя людзі з вучонымі званьнямі, літаратурнымі здольнасьцямі. Адны з іх, як добры празаік Міхась Парахневіч, зламаліся, другія, як Мікола Зяньковіч, якога ўзялі ў ЦК КПСС, дзе зусім за кароткі час прайшоў шлях ад інструктара да намесьніка загадчыка аддзелу, выдатна праявілі сябе, пакінулі сьлед і добрую памяць у іншых калектывах. Мне з першых жа дзён вельмі не падабалася маральныя экзекуцыі Паўлава, як і незразумелым было пакорлівае маўчанне калегаў. Пэўна ж, думаў, адчуваюць

свае прамашкі, сваю віну, калі моўчкі згаджаюцца, не супраціўляюцца, не абураюцца, не даюць здачы, не бароняць свой гонар і чалавечую годнасьць... Потым стаў прыглядацца, карыстаючыся добрым стаўленьнем да сябе, іншы раз устаўляў рэплікі, каб зьвесьці на жарт, трохі астудзіць гнеўны імпэт, за што тут жа атрымліваў заўвагу і незласьлівага лёгкага прачуханца. І вось наступіла і мая чарга...

Вэрхал ўсчаўся пасьля прамой трансляцыі футбольнага матча, які ўпершыню на тэлебачаньні з пачатку да канца каментаваў па-беларуску Алесь Камароўскі. Гэта была нечуваная дзёрзкасьць. З самай раніцы тэлефоны ў ЦК аж разагравaліся ад званкоў. То былі пераважна пратэсты, і больш за ўсё ад вайскоўцаў. Званілі і тыя, хто вельмі ўхваляў пачатае, але рабіў заўвагі і прапаноўваў падказаць тэлевізійнікам чыста беларускія аналагі спартыўна-футбольных тэрмінаў. Памятаю, пазваніў нейкі грузін і з акцэнтам на ламанай беларуска-рускай трасянцы стаў тэмпераментна хваліць, напорыста патрабаваць, каб усе перадачы на беларускім тэлебачанні ішлі толькі па-беларуску. Мяне гэта вельмі кранула, даў яму тэлефон Паўлава і папрасіў пазваніць і сказаць усё яму. Такім макарам пераадрасаваў яшчэ некалькі званкоў. Ня ведаю, якая там размова адбылася, але Паўлаў паклікаў не мяне, а майго інструктара Ганну Сьцяпанаўну Лазоўскую, свайго намесьніка Гаўрылу Міхайлавіча Конанава і загадаў тэрмінова рыхтаваць пытаньне на бюро ЦК з аргвывадамі. Назаўтра пошта прынесла і пісьмовыя водгукі. Мо праз кожныя паўгадзіны мы перазвоньваліся па “вяртушцы” з Генадзем, абменьваліся інфармацыяй, узгаднялі і ўдакладнялі нашыя дзеяньні. Мы былі ўпэўненыя, што робім правільна, і не было ні ценю сумненьня, ніякай разгубленасьці ці страху. Генадзь размаўляў з АТК, і той успрыняў усё гэта даволі спакойна і нейтральна, сказаў, што высокапастаўленыя вайсковыя чыны, відаць, з нечае падачы мусіруюць пастаноўку пытаньня на бюро, але ня можам жа мы па кожнай спартыўнай тэлеперадачы зьбіраць бюро. На душы палягчэла...

Пад канец дня ўзбуджаны, змрочны Паўлаў сабраў, хто быў на месцы, на тэрміновую нараду і, махаючы стосам пісем, з ледзь прыхаваным трыумфам у голасе з ходу ў сваёй звычайнай манеры атакаваў мяне поўным наборам абвінавачаньняў, ярлыкоў і лаянак. У мяне была радасьць ад душы ад масы званкоў падтрымкі на тэлебачаньне, пра што толькі-толькі па тэлефоне расказаў Генадзь, і гнеўныя тырады, пагрозы, абразы Паўлава мала краналі, аж сам дзівіўся, наколькі спакойна ўспрымаю іх, быццам тычыліся не мяне ўвогуле, і гэта разьятрывала яго яшчэ больш. Стоячы, размахваў рукамі, крычаў, што не давярае, і дня не намераны трымаць у аддзеле, гразіў адабраць партыйны білет. Гэта было ўжо занадта. Я падняўся, стрымана, але цьвёрда заявіў, што ня ён мне ўручаў партбілет і не яму адбіраць, а ўсе ягоныя абвінавачаньні аблыжныя, несур’ёзныя, сьмеху вартыя, што грубіць абражаць сябе я не дазволю. Ці то ён не разумеў сэнс слова “аблыжны”, ці яно падалося яму надта ж абразьлівым, кранула за жывое, але літаральна ўзарваўся, ледзьве валодаючы сабой ашалелатупа паўтараў: я табе дам “аблыжны”, я табе пакажу “аблыжныя”!.. Першы раз бачыў ягоныя ашклянелыя, засмужаныя павалокай, налітыя злосьцю вочы, і міжволі працяла незразумелае пачуцьцё, замешанае на нейкім падсьвядомым містычным страху і адначасова спагадзе і спачуваньні яму. А ён не сунімаўся, то пераходзіў на неразборлівы крык, то трохі збаўляў тон, падбіраючы самыя крыўдныя і абразьлівыя словы, відавочна правакуючы мяне на скандал, а я на злосьць яму працягваў заставацца спакойным і стрыманым. Але праз нейкі час не рэагаваць стала немагчыма, і наколькі яшчэ мог спакойна, прапанаваў яму астудзіцца, супакоіцца, спыніць гэты базарны лямант, а затым ужо пагаварыць сур’ёзна, без абвінавачаньняў, па-сутнасьці, як таго вымушае статус нашай саліднай установы. Паўлаў ажно разгубіўся ад такога майго нахабства...

У калідоры адны адкрыта ці неўпрыкмет пад локаць паціскалі мне руку, другія з заклапочаным выглядам разьбягаліся па сваіх кабінетах. Паўлава баяліся, але ня надта паважалі і ў сваім, і ў сумежных аддзелах. Як і ў падведамасных, так і непадведамасных аддзелу прапаганды арганізацыях, ўстановах, творчых саюзах і вучэбных установах, дзе ён меў дурную славу і процьму пакрыўджаных, каму паламаў кар'еру, насаліў, нахаміў – і калі было за што, і без дай прычыны. І яны люта ненавідзелі Паўлава – хто спадцішка, асьцерагаючыся ягоных сексотаў, хто адкрыта і дэманстратыўна, як ягоны намесьнік Васіль Каленчыц, які не хаваў, што згадзіўся пайсьці ў памочнікі да Машэрава толькі з адной мэтай адкрыць таму вочы і зваліць Паўлава. Не пасьпеў...

А ўвогуле гэта дзіўная і рэдкая зьява, калі начальніка цэняць, паважаюць як прафесіянала і ненавідзяць як чалавека. Гэткай дваістай фігурай і быў загадчык галоўнага ідэалагічнага аддзелу ЦК. Мне падабаліся ягоныя публіцыстычныя, сатырычныя творы, фэналагічныя нататкі і замалёўкі, якія ён друкаваў пад сваім прозьвішчам у "Полымі", "Нёмане", "Вожыку", "Роднай прыродзе" і іншых выданьнях. Праўда, куды слабейшымі, кволенькімі падаваліся ягоныя спробы ў мастацкай прозе. Ён літаральна расьцьвітаў, калі я часам заводзіў гаворку пра ягоныя творы – і калі хваліў, і калі рабіў нейкія заўвагі. Хацелася яго зразумець, многае даравацъ, апроч, канечне ж, беспардоннага хамства ў дачыненьнях з падначаленымі і, найперш, безумоўна, ваяўнічага русіфікатарства, зьняважлівага стаўлення да беларускай мовы і нацыянальнай культуры. Памятаю, неяк гаварыў па "вяртушцы", здаецца, з дырэктарам праграм Пятром Каваленкам, натуральна, пабеларуску і ў гэты час падаў голас другі, звычайны гарадскі тэлефон. Як заўсёды, падняў трубку, папрасіў пачакаць хвіліначку, хуценька закончыў гаворку па "вяртушцы", пераключыў увагу на гарадскі. На дроце быў... Паўлаў! Мо з паўхвіліны ён чуў нашую гаворку, і першае, што сказаў: на каком это ты еще языке разговариваешь?! І ў ягоным зьдзеклівым голасе быў і недвухсэнсоўны напамінак, на якой мове належыць размаўляць у кабінетах ЦК, і непрыхаваная абраза і пагарда да роднай мне мовы. Адказаў яму рэзка, непрыязьнена, з выклікам: а вы што, ужо не пазнаеце мову рэспублікі, у якой жывеце?! Паўлаў зразумеў, што хапіў лішку, спакойным, прымірэнчым голасам павёў гаворку пра нейкую службовую справу. Ні тады, ні цяпер для мяне застаецца неспасцігальным, як чалавек, які дастаткова добра валодае беларускай мовай, піша на ёй свае артыкулы, гумарэскі, фельетоны, памфлеты, замалёўкі і зацемкі для беларускамоўных выданьняў, можа грэбліва ставіцца да яе. Неяк, калі яшчэ ў нас былі добрыя, паважлівыя службовыя стасункі, ён з характэрнай упэўненасьцю і катэгарычнасьцю ўбіваў у галаву мне, недасьведчанаму, што мова – гэта ня больш і ня менш, чым рэлейныя лініі, тэлефонныя правады, радыё і тэлеперадатчыкі, газетная папера, іншыя камунікатыўныя сродкі, а ўсё астатняе – нацыяналістычная балбатня і несусьветнае глупства...

Тады ж у Паўлава, дзе прысутнічаў аддзел у поўным складзе, удавалася на дзіва лёгка саўладаць з эмоцыямі, аднак, як толькі застаўся адзін у сваім кабінеціку, не знаходзіў сабе месца, эмоцыі рваліся наверх, карцела выліць некаму ўсё, што накіпела на душы, а лепш дык даць здачы, выказаць усё, аднак нешта стрымлівала вяртацца да яго і даказваць тэт-а-тэт... Пазваніў Генадзь, па маім голасе зразумеў, што нешта здарылася, паабяцаў праз хвілінаў сорак па дарозе з работы зазірнуць да мяне ў "начлежку". Ніколі яшчэ сыход з ЦК ня быў такім рэальным і непазьбежным. Гняло толькі адно: не пасьпеў атрымаць тут, у Менску, кватэру. І што цяпер застаецца? Нясолана хлябнуўшы, вяртацца ў Гародню ды шукаць нейкую работу. Павагаўшыся, рашыў "паспавядацца" ў АТК, які, звычайна, да позьняга вечару заседжваўся ў сябе ў кабінеце...

Аляксандр Трыфанавіч выслухаў з лёгкай хітраватай усьмешачкай, запытаў,

ці не сарваўся я пры сьведках на грубасьць і лаянку? Запэўніў, што не, і ён пахваліў, супакоіў: не бяры да галавы – пакуль я тут, нічога ён табе ня зробіць... На душы адразу ж адлягло, а ён строга наказаў: трымай сябе ў руках, як бы не правакаваў Паўлаў на людзях, пры сьведках – не сарвіся, не дай яму такой радасьці, хітравата ўсьміхнуўся і параіў:

– А ты дулю ў кішэні трымай і цярпі. Альбо ўяўляй сабе, што разьбіваеш яму аб лоб сырыя яйкі – і жаўткі, бялкі расплываюцца па ягонай фізіяноміі... Паспрабуй – памагае... А бяз сьведак, калі ніхто ня чуе – сьмела пасылай к бенінай матары, хай потым некаму паспрабуе даказаць... А каб супакоіцца – абыйдзі два-тры кругі вакол ЦК, пасядзі ў скверыку. Праходзіць...

Ня ведаю, які эфект ад дулі ў кішэні, бо не пасьпеў апрабаваць, а вось пасылаць бяз сьведак Паўлава да бенінай мамы ды ў дадатак яшчэ пакрыць смачным мацюком – насамрэч вельмі памагала... Аднойчы, калі Паўлаў пры сьведках стаў выходзіць з сябе, правакуючы мяне на скандал, нечакана ўявіў, што разьбіваю яйкі аб ягоны лоб – і ня мог стрымацца ад рогату ў самы што ні ёсьць эмацыянальна-напружаны момант, ад чаго Паўлаў аж пасінеў. Ён глядзеў з лютасьцю ў вачах, як мяне душыць сьмех, пэўна, прымаў трохі за ненармальнага, як дарэчы, і я яго, са спачуваньнем...

А праз колькі дзён адбыліся падзеі, якія на нейкі час усталявалі між намі амаль што поўнае паразуменьне. Стала вядома, што тэлерадыёкамітэт сабраўся наведаць Пётр Міронавіч Машэраў. Па ўсіх канонах у ягонай сьвіце належала быць і загадчыку сектару як непасрэднаму куратару, аднак Паўлаў заявіў, што мне там рабіць няма чаго, паколькі Машэраў запрасіў ехаць разам яго, Паўлава. І цяпер шкадую, што не ўдалося пабачыць на свае вочы, паслухаць на свае вушы, хоць ужо вечарам мне ўсё падрабязна расказаў Генадзь. Але ня буду пераказваць з ягоных словаў, спадзяюся, ён сам напіша, каб прасьвятліць праблему, вакол якой наплецена нямала кашоў, а менавіта – стаўленьне Машэрава да беларускай мовы, якой ён, як вядома, не карыстаўся ні ў побыце, ні ў публічнай дзейнасьці. Прыгадаю толькі пра незвычайныя падзеі, якія сталі адбывацца адразу ж пасьля ягонага наведаньня тэлерадыёкамітэту. Не памятаю, дзе быў Кузьмін – у ад'езьдзе ці ў адпачынку, бо назаўтра ж нараду з удзелам прадстаўнікоў аддзелаў навукі і навучальных установаў, культуры, прарэктара БДУ і вядучых выкладчыкаў факультэту журналістыкі на чале з легендарным дэканам Рыгорам Васільевічам Булацкім сабраў ня ён, а Паўлаў. Калі ён абвясьціў парадак дня – абмеркаваньне і выпрацоўка мераў і захадаў па павышэньні прэстыжнасьці беларускай мовы, у многіх, у тым ліку зьбянтэжанага Булацкага, аж сківіцы адвісьлі. І не таму, што праблема не актуальная, а ня верылася вушам, было неспасьцігальна, што ёю займаецца Паўлаў. Той коратка праінфармаваў аб сустрэчах Машэрава ў Дзяржтэлерадыё і адразу ж у сваёй наступальна-катэгарычнай манеры атакаваў факультэт журналістыкі: маўляў, Пётр Міронавіч страшэнна зьдзіўлены і абураны, што выпускнікі факультэту не валодаюць беларускай мовай, ня могуць у кадры нават пытаньня задаць субяседніку так, як той размаўляе. Ён "чысьціў", не ашчаджаючы самалюбства айца рэспубліканскай журналістыкі Булацкага і ягоных калегаў за непрафесіяналізм саміх і насаджэньне непрафесіяналізму ў беларускамоўных выданьнях. "Для каго мы рыхтуем кадры?! – грозна наступаў Паўлаў. – Для Тамбова, Пензы ці для сваёй рэспублікі?" Усё гэта з ягоных вуснаў падавалася нейкім сюррэалізмам. А для мяне, хто ўжо меў інфармацыю аб сустрэчах Машэрава, дык самым дзіўным і неверагодным было: а Паўлаў ніводным знакам не выдае, што гаворыць з чужога голасу, наступіўшы на горла ўласнай песьні. Але што б там ні было, а цешыла, уздымала, што нарада рэальная і праводзіць яе Паўлаў са згоды і па даручэньні самога Машэрава. З захапленьнем думаў: ну й мудзёр жа Пётр Міронавіч! Змусіць

апантанага антыбеларуса напорыстага, як бульдозер, Паўлава, ягонымі рукамі рабіць беларускую справу!.. Гэта мог толькі Машэраў, майстар вышэйшага палітычнага пілатажу...

Выгаварыўшыся, Паўлаў прапанаваў прысутным выказацца па сутнасьці, унесьці канкрэтныя прапановы. Мяне прыемна зьдзівіла, што не знайшлося ніводнага сумнеўнага голасу наконт надзённасьці і актуальнасьці ўзьнятай праблемы – пагаджаліся, што яна ня толькі сасьпела, але і перасьпела. Узбуджаныя нязвыкласьцю, неардынарнасьцю тэмы абмеркаваньня выказвалі надзвычай цікавыя, часам вельмі сьмелыя, радыкальныя прапановы і меркаваньні. Паўлаў даручыў мне і Міколу Жылінскаму акуратна браць іх на аловак, паколькі менавіта нам давядзецца рыхтаваць чарнавы варыянт мерапрыемстваў ЦК па гэтай набалелай праблеме.

За час работы ў абкаме, ЦК мне даводзілася прыдумваць, складаць, клеіць, кляпаць сотні, мо тысячы і важных, малаважных, проста для праформы, адводу вачэй начальства рознага кшталту казённых папераў, але яшчэ ніколі і ніводнай не аддаваўся з такім імпэтам і самааддачай, як гэтым разам. Нельга было паддавацца эйфарыі, упадаць у ілюзіі, адрывацца ад рэаліяў, належала гранічна цьвяроза ўзважваць, ацэньваць рэальную магчымасьць ажыцьцявіць у тых умовах максімальна карысную для нацыянальнай справы работу, ня выклікаўшы падазрэньняў Масквы і гвалту-лямантy мясцовых вялікароскіх шавіністаў. Крок за крокам трэба было рухацца па лязу брытвы, узброіўшыся канкрэтнымі цытатамі і спасылкамі на класікаў марксізму-ленінізму, дакументамі зьездаў, пленумаў КПСС. Работа была зробленая ў максімальна кароткія тэрміны і з трэцяга ці чацьвёртага заходу абкарнаны план мерапрыемстваў быў падпісаны Паўлавым і ўхвалены наверсе. Нягледзячы на абмежаванасьць і палавінчатасьць, гэта быў мо першы прарыў: афіцыйна легалізавалася беларусізацыя факультэту журналістыкі, ухвалялася пашырэньне тэле і радыёвяшчаньня на нацыянальнай мове, намячалася падрыхтоўка і пераход на беларускую мову многіх перыядычных выданьняў, у тым ліку “Сельской газеты”, дубляваньне выпускаў гарадзенскай і брэсцкай абласных газетаў на дзьвюх мовах, перавод асобых раёнак ў заходніх абласьцях на нацыянальную мову, пашырэньне яе ў візуальнай прапагандзе і нагляднай агітацыі, павышэньне ўдзельнай вагі мастацкай і грамадска-палітычнай літаратуры на нацыянальнай мове і г.д.

На нейкі час у нас з Паўлавым зноў усталяваліся нармальныя, часам нават даверчыя статункі. Апроч службовых, мы часта вялі гаворку пра творчыя справы, Саюз пісьменьнікаў, куды зьбіраліся паступаць. Ён настойліва рэкамендаваў мне напісаць аповесьць, цэнтральным персанажам якой быў бы наш брат-журналіст з усімі слабінкамі характару прадстаўніка другой старажытнай прафесіі. Я не прыдаў ягонаму пажаданьню сур’ёзнай увагі, але ідэя, мусіць, засела ў падсьвядомасьці, пачынала жыць, абрастаць канкрэтнымі абрысамі. Неяк гартаў на прадмет зьнішчэньня свае паперы і наткнуўся на пачатую яшчэ ў маладосьці сатырычную аповесьць, закончыць якую не хапіла духу. Задумка была такая: нейкі напаўнедалэнга, напаўавантурыст, гнаны няўдачамі, патрапляе ў камічныя сітуацыі, сутыкаецца з рэчаіснасьцю, дастойнай выкрыцьця сатырычнымі сродкамі. Потым цюкнула: ды падобны сюжэт выкарыстаў яшчэ Гогаль у “Мёртвых душах”, і прапала жаданьне працягваць. А тут прагледзеў два калісь напісаныя разьдзельчыкі і падумаў: а чаму б не скарыстаць няблага зроблены камічны эпізод затрыманьня авантурнага героя-недалэнгі ў незнаёмым горадку, ягонага вымушанага начлегу ў камеры папярэдняга зьняволеньня з забулдыгамі-карцёжнікамі, зрабіўшы яго сваім новым антыгероем, журналістам-няўдачнікам, характар якога ў агульных рысах ужо склаўся ў галаве! Работа захапіла, і не прайшло і году, як “Усмешка Фартуны” была напісаная і як заўсёды, аддаў яе ў “Маладосьць”. Перад тым хацеў

паказаць яе Паўлаву, але не паказаў – пасьля сьмерці Машэрава нашыя стасункі зноўку сапсаваліся. Ён узяўся за сваё: ухваленыя пры Машэраве мерапрыемствы паціху ігнараваліся, забываліся, спускаліся на тармазах. Новы гаспадар рэспублікі Ціхан Якаўлевіч Кісялёў, пабыўшы ў віцэ-прэм’ерах Саюзу, пахадзіўшы па крамлёўскіх калідорах і кабінетах, добра ўведаў законы, норавы, звычкі ейных усясільных насельнікаў, таму праяўляў у далікатных і сьлізкіх пытаньнях крайнюю асьцярожнасьць і абачлівасьць, мо нават баязьлівасьць, хоць у ягонай душы куды больш, чым у папярэднікаў, дый затым у пасьлядоўнікаў, жыла беларускасьць – я на свае вочы бачыў прысланыя ім з крамлёўскай бальніцы запіскі Сяргею Законьнікаву, напісаныя без адзінай памылачкі па-беларуску. Кісялёў, як ніхто з кіраўнікоў вышэйшага эшалону, тонка валодаў дасьціпным народным гумарам, меў востры розум і такі ж востры язык. Мог пазваніць раненька радавому інструктару і строгім голасам: ну, што, даражэнькі, дажыўся, дастукаўся? У небаракі дрыжыкі ў каленках, сьцяміць не можа, у чым справа, дзе спраставалосіўся. І пасьля паўзы сам Першы віншуе яго з юбілеем ці проста днём нараджэньня, выказвае “крыўду”: а мяне то забыўся запрасіць... Імяніньнік ад нечаканасьці губляе мову, мармыча нешта: ды я-я, ды я-я-я... Кісялёў “велікадушна даруе”, нагадвае, каб не забыў запрасіць на свой наступны круглы юбілей, а сёньня каб узяў чарку і за ягонае здароўе... Альбо: субота, нейкі аўрал, усе на рабочых месцах. У кабінет да Першага сьмела і ўпэўнена, не спытаўшы дазволу, заходзіць загадчык аднаго з вядучых аддзелаў, без пінжака ў кашулі з кароткім рукавом. Ціхан Якаўлевіч перапыняе сваю заклапочаную гаворку па тэлефоне, просіць у трубку: пачакай хвілінку, тут зайшоў адзін наш – мусіць, хоча ў лазьню запрасіць... Наведвальніку нічога не застаецца, як куляй выскачыць з кабінету...

Аднак ніхто афіцыйна не адмяняў прынятыя пры Машэраве мерапрыемствы, не абвяшчаў іх памылковымі. Таму я меў поўнае права выступаць на калегіях Дзяржтэлерадыё, цэнтральных і рэгіянальных нарадах тэлерадыёжурналістаў ад імя ЦК з жорсткай крытыкай у тым ліку па дамоўленасьці з Генадзем персанальна яго за марудны і непасьлядоўны перавод вяшчаньня на мову карэннага насельніцтва. Дружнымі намаганьнямі, не выключаючы і такіх хітрыкаў, настойліва і няўхільна працягвалі рабіць сваю справу. Ня ўсё ішло проста і гладка, давод-зілася набірацца цярпеньня, пераадольваць непаразуменьне, зацятае супраціўленьне спрэс зрусіфікаваных творчых і тэхнічных работнікаў, рэжысуры і г.д., асабліва на тэлебачаньні, і рознага кшталту вялікаросскіх шавіністаў і ў калектыве, і па-за калектывам, надзвычай нахрапістых, агрэсіўных, якія пачувалі сябе тут поўнымі гаспадарамі. Наўрад ці ўдалося б вытрымаць іхні шалёны націск, нечага дамагчыся, каб Генадзь ня меў розуму, таленту, чалавечага абаяньня наладжваць добрыя, даверчыя стасункі з кіраўнікамі рэспублікі. Яго любіў, паважаў, з ім лічыўся Машэраў, у яго адразу ж склаліся стасункі з Кісялёвым. Паўлаў ня мог ня бачыць і не лічыцца з гэтым, як і ня ведаць праз сваіх сексотаў пра мае публічныя выступленьні, аднак нічога сур’ёзнага прадпрыняць ня мог, апроч злосьці ды розных дробных прыдзірак...

А тым часам трэба было ажыцьцявіць яшчэ адну насамрэч грандыёзную задуму – стварыць незалежную ад ЦТ самастойную беларускую праграму і выдаваць яе на тэрыторыі рэспублікі замест другой маскоўскай, дзе пераважна трансьляваліся ў паўторы перадачы першай ды толькі зрэдку арыгінальныя, па нейкіх прычынах забракаваныя на асноўным канале. Усе саюзныя рэспублікі хто раней, хто пазьней сфармавалі свае тэлепраграмы, адна нашая ўзорна-інтэрнацыянальная беднай сіроткай тулялася са сваімі тэлеперадачамі па праграмах Цэнтральнага тэлебачаньня (вядома ж, толькі на сваёй тэрыторыі) па больш-менш, але часьцей

за ўсё па зусім непрыдатных адрэзках часу, калі тэлевізар глядзяць хіба што піянеры ды пенсіянеры. Нашая дырэкцыя праграмаў толькі тым і займалася, што ўзгадняла, выпрошвала час у Масквы, паколькі ня мела права без санкцыі ЦТ закрыць ніводнай іхняй перадачы як па першай, так і па другой праграмах. Нашых запалоханых, зацюканых прававерных інтарнацыяналістаў панічна, як чорт ладану, палохалі самі тэрміны “незалежная”, “самастойная” ды яшчэ ў спалучэньні з “беларуская”, а замахвацца на адну з праграмаў ЦТ падавалася нечуваным сьвятатацтвам. Паўлаў з парогу адрынуў прапановы Бураўкіна, угледзеўшы ў іх незамаскіраваную ідэалагічную дыверсію нацыяналістычнага кшталту. АТК паставіўся даволі асьцярожна, без асаблівага імпэту, хоць і ведаў станоўчае стаўленьне да самастойнай рэспубліканскай праграмы кіраўніцтва Дзяржтэлерадыё СССР, пазіцыю ЦК КПСС. Машэраў рашуча падтрымаў і даў сваю прынцыповую згоду пачынаць падрыхтоўчыя работы, каб да Новага году, напярэдадні чарговага зьезду Кампартыі Беларусі самастойная рэспубліканская праграма выйшла ў эфір, абяцаў сваё спрыяньне ва ўсім. Да вызначанага тэрміну заставалася трохі больш за паўгоду. Патрэбны былі каласальныя высілкі як творчага, так і тэхнічнага плану. Мабыць, найперш творчага, каб распрацаваць канцэпцыю і запусціць у вытворчасьць, адпрацоўваючы свой стыль, сваю адметнасьць, уласныя цыклавыя перадачы і каб па якасьці яны не саступалі маскоўскім, складалі ім рэальную канкурэнцыю, без чаго рэспубліканская праграма пацерпіць поўнае фіяска. Менавіта на гэта была скіравана ўся творчая дзейнасьць галоўных рэдакцыяў, вакол гэтай задачы вяліся творчыя пошукі, рыхтавалася матэрыяльна-тэхнічная база. Па лініі Мінсувязі ўводзіліся ў эксплуатацыю новыя перадатчыкі, рэлейныя лініі, і ўжо да канца году была рэальная магчымасьць забясьпечыць упэўнены прыём адной тэлепраграмы на 93, двух – на 86 і трох – амаль на 25 адсотках тэрыторыі рэспублікі. Падрыхтоўчыя работы ішлі поўным ходам, і ўжо, здавалася, нішто ня зможа затармазіць, тым больш спыніць іх. Але восеньню трагічна загінуў Машэраў, а новы Першы ўнікаў у справы, прападаў у паездках то ў Маскве, то па абласьцях і раёнах. Тэрмінова трэба было прымаць падрыхтаваную больш чым месяц назад пастанову бюро, юрыдычна ўзаконіць самастойную рэспубліканскую тэлепраграму і тэрмін яе ўвядзеньня. АТК колькі раз соваўся з гэтым да Кісялёва, але той не даваў гаварыць: трэба разабрацца, зараз мне не да гэтага... Паўлаў ведаў гэта, ажыў духам, рашуча стаў на сваю ранейшую пазіцыю, спадзяваўся, мусіць, узяць рэванш, а найперш прадэманстраваць новаму начальству сваю існую інтэрнацыяналісцкую сутнасьць. АТК трымаўся асьцярожна і нейтральна. Над будучай тэлепраграмай павіс вялікі пытальнік. Генадзь рынуўся да вельмі занятага Кісялёва, і тут жа без усялякіх праблемаў атрымаў аўдыенцыю, у час якой былі зьнятыя ўсе пытаньні, дасягнутае поўнае ўзаемапаразуменьне, пастанова аб рэспубліканскай праграме была аднагалосна прынятая на чарговым пасяджэньні бюро.

Людзям ня надта падабаецца, калі ў іх адбіраюць нешта знаёмае, звыклае, нават калі ўзамен даюць больш дасканалае, лепшае. Таму прадбачылі, што гэтакая кардынальная ломка тэлеэфіру выкліча неадназначную рэакцыю. Канечне, больш за ўсё хвалявала, трывожыла непазьбежная пратэстная рэакцыя тэлегледачоў. Каб згладзіць, самартызаваць, зрабіць яе мінімальнай, важней за ўсё было заявіць пра сябе адразу, застведчыць свой твар з першых жа выпускаў. Таму праграму на першы тыдзень фармавалі асабліва ўважліва і патрабавальна. Разам з Генадзем, ягоным намесьнікам па тэлебачаньні Віталем Дзьмітравічам Чаніным, дырэктарам праграмаў Пятром Савельевічам Каваленкам, галоўным рэжысёрам і мастаком да позьняй ночы праглядалі, адбіралі ўсё лепшае, арыгінальнае, што падрыхтавалі галоўныя рэдакцыі, абноўленае мастацкае і музычнае афармленьне,

застаўкі. Пайшоў насустрач і кінапракат, прадаставіўшы ня толькі лепшыя старыя, але новыя кінафільмы, якія яшчэ не былі ў тэлеэфіры. А ў Маскве выпрасілі копію папулярнага шматсерыйніка "Сямнаццаць імгненьняў вясны", які ўжо даўненька не зьяўляўся ў тэлеэфіры.

Навагоднія сьвяты і яшчэ дні два-тры пасьля іх прайшлі адносна спакойна, хоць тэлефоны і ў Дзяржтэлерадыё, дый ў ЦК не змаўкалі з ранку да вечару. Званілі людзі з розных месцаў, хто вельмі ўхваляў перадзел тэлеэфіру, высока ацэньваў новую беларускую праграму, але пераважная большасьць званкоў была ад незадаволеных – і спакойных, і поўных абурэньня. Як і можна было чакаць, крайне незадаволенымі аказаліся тыя 5-8 адсоткаў тэлегледачоў, што з-за разводкі праграмаў пазбавіліся магчымасьці бачыць Менск. Найперш у беларуска-літоўскім і беларуска-латышскім памежжы, на паўднёвым усходзе Гомельшчыны і паўночна-усходнім рэгіёне Віцебшчыны. Каб супакоіць людзей, з дазволу ЦТ вечарам у лепшы вячэрні час выйшлі на першую праграму з перадачай, у якой сьпецыялісты рэспубліканскага тэлецэнтру і Мінсувязі падрабязна расказалі аб планах і перспэктывах поўнага ахопу праграмай Беларускага тэлебачаньня ўсёй тэрыторыі рэспублікі, дзе і калі ў бліжэйшыя два гады будуць установлены новыя перадатчыкі, рэканструяваны тэлецэнтры ў Гомелі і Віцебску з заменай састарэлых перадатчыкаў і ўзьвядзеньнем новых, амаль удвая вышэйшых тэлевежаў. Тут жа даваліся кансультацыі па абсталяваньні складаных антэнаў, з дапамогай якіх можна прымаць перадачы з Менску практычна ў любым населеным пункце. З такімі кансультацыямі сьпецыялісты рэгулярны выходзілі ў эфір, парады, схемы друкаваліся ў рэспубліканскім і мясцовым друку яшчэ за два месяцы да гэтага, але праўду кажуць: мужык не перахрысьціцца, пакуль гром ня грымне...

На чацьвёрты-пяты дзень на ЦК абрынуўся літаральна вал пісьмовых пратэстаў, ад іх жа і аж раскаляліся тэлефоны. І амаль усе – на закрыцьцё перадачы "Добрый вечер, малыши", якая трансьлявалася па другой праграме. Замест яе беларуская "Калыханка" з дзедам-Барадзедам, на думку пратэстуючых, і блізка не ішла ні ў якое параўнаньне. Прасілі, патрабавалі вярнуць дзецям любімых Хрушу і Сьцяпашу. Вайскоўцы з Паставаў і іхнія сем'і ў калектыўным лісьце з ледзь ці ня тысячай подпісаў абураліся, што першую праграму перакінулі на другую кнопку і яна прымаецца ў іх у горшай якасьці. Былі яшчэ трывожныя лісты футбольных балельшчыкаў: а што будзе з матчамі, якія часам трансьляваліся толькі па другой праграме? Ну і, канечне ж, лісты з рэгіёнаў, дзе ўвогуле перасталі прымаць Беларускае тэлебачаньне.

Назаўтра з самай раніцы мяне і Гаўрылу Міхайлавіча Конанава, які пасьля Каленчыца стаў намесьнікам загадчыка і курыраваў сродкі масавай інфармацыі, паклікаў да сябе радасна-узбуджаны Паўлаў і з ходу:

– Ну, што-о?! Дагуляліся!.. Пасьля абеду зьбіраецца бюро і ўсе вашыя экспэрыменты будуць пахераныя. Тэрмінова адкручвайце назад! Каб сёньня ж усё стала на сваё месца...

Мы дружна запярэчылі: ня трэба пароць гарачку, можна сёе-тое папpавіць – і ўсё аціхне, уляжацца... Дый яшчэ невядома, якое рашэньне прыме бюро, ці захоча адмяняць сваю нядаўна прынятую пастанову аб арганізацыі рэспубліканскай праграмы. Ён катэгарычна стаяў на сваім. Я заявіў, што такой каманды аддаваць ня буду, а каб і аддаў насуперак сваёй волі, мяне ўсё роўна не паслухаюцца ні Бураўкін, ні Чанін. Такую каманду можа аддаць толькі Ціхан Якаўлевіч. Паўлаў глянуў на Гаўрылу Міхайлавіча: знайдзі Бураўкіна і перадай загад...

– Чый? – удакладніў Конанаў.

– Якая табе розьніца, хоць бы мой!..

– Тады самі і перадавайце! – нечакана для мяне дзёрзка запярэчыў заўсёды

спакойны, вытрыманы, далікатны Гаўрыла Міхайлавіч. – Я ня маю права адмяняць пастанову бюро ЦК...

– Дык вось ты які!– узьвіўся пагрозьліва Паўлаў. – Чаго ж ты хочаш?!

– Каб была свая тэлепраграма... – коратка і спакойна адказаў Конанаў.

У кабінет заглянула сакратарка Сьвета Дрынеўская і сказала, што мяне тэрмінова шукае Кузьмін.

Аляксандр Трыфанавіч быў заклапочаны, папытаў, дзе знайсьці Бураўкіна. Я шчыра прызнаўся, што Генадзь учора прымаў намесьніка Лапіна (тады старшыні Дзяржтэлерадыё СССР) Папова і зараз адпачывае пасьля праводзінаў. АТК усьміхнуўся з разуменьнем, мусіць, прыгадваючы маскоўскага візіцёра, якога прымаў учора, і папрасіў тэрмінова зьвязацца з Бураўкіным, перадаць, каб ён неадкладна быў у яго, а на мой запытальны позірк пацьвердзіў тое, што я ўжо чуў ад Паўлава: пасьля абеду зьбіраецца бюро з намерам у сувязі з масавымі пратэстамі адмяніць прынятае рашэньне, вярнуцца на ранейшы рэжым тэлевяшчаньня, а рэспубліканскую праграму ўводзіць паступова. Я недаўменна паціснуў плячыма, сказаў, што не разумею, як гэта можна ўводзіць паступова – тут альбо ёсьць, альбо няма... Ён ня стаў нічога мне тлумачыць, нецярпліва прысьпешваючы: ты мне хутчэй шукай Бураўкіна, а потым разьбярэмся, што да чаго... Дарэчы, заходзьце разам...

Генадзь жыў недалёка на вуліцы Янкі Купалы, і пачуўшы пра сітуацыю, праз хвілінвў дзесяць занепакоены, нявыспаны быў у мяне. Настроены ён быў рашуча: не дадуць рабіць праграму – тут жа ідзе ў адстаўку. Я сказаў, што зраблю тое ж самае, аднак Генадзь разважыў: ты хоць кватэру атрымай, дый нельга рабіць гэтакі падаруначак Паўлаву...

АТК пачаў без усялякіх уступаў: напярэдадні зьезда кампартыі ўся рэспубліка пастаўленая на вушы, ведаеш, якія страсьці-мардасьці могуць разгарэцца? Таму трэба неадкладна адступіць, да сваёй праграмы рухацца паступова, паэтапна... І працягнуў яму кароценькі, на чвэрць старонкі праект пастановы бюро з двух пунктаў – адмяніць ранейшую пастанову і з заўтрашняга дня вярнуцца да былога фармату вяшчаньня. На паперчыне ўжо было некалькі подпісаў, у тым ліку Паўлава і ягоная, Кузьміна:

– Пазнаёмся, завізіруй і хуценька давай каманду неадкладна адкручваць усё назад...

Генадзь прачытаў уважліва, яшчэ больш пазмрачнеў і рашуча, зацята сказаў:

– Візіраваць гэтага я ня буду... І даваць каманду паварочваць назад – таксама. Хай адмяняе праграму іншы старшыня...

– Як гэта разумець? – сумеўся АТК.

– Проста, – адказаў Бураўкін. – Забароніце праграму – я тут жа іду ў адстаўку...

– Гэта ты сур’ёзна? – зьмераў яго зьдзіўленым і дапытлівым поглядам АТК, не зусім верачы, што ён насамрэч здольны на такое.

– Больш чым сур’ёзна. Завізірую толькі тады, калі ў пастанове будзе яшчэ адзін, трэці пункт: вызваліць Бураўкіна па ўласным жаданьні альбо па ягонай просьбе... – заявіў Генадзь, не пакідаючы ніякага сумненьня, што для яго гэта справа прынцыпу і не можа быць ніякага кампрамісу.

– Ладна, ты пасядзі тут адзін ды добранька падумай... – трохі разгублена сказаў АТК, кіўнуў да мяне: – А мы пайшлі, каб не замінаць яму думаць...

Моўчкі мінулі прыёмную, у калідоры ён павярнуў налева, пэўна, да Кісялёва, а я страшэнна прыгнечаны спусьціўся паверхам ніжэй у свой кабінецік, стаў нецярпліва чакаць Генадзя. Ён зьявіўся праз паўгадзіны. Сказаў, што зноў наадрэз адмовіўся візіраваць праект і ўрэшце рэшт расстроены АТК паслаў яго к чортавай матары...

Што мяне не запрасілі на бюро – зразумела, а вось чаму праігнаравалі, палічылі непатрэбнай Генадзеву прысутнасьць – гэта ўжо пытаньне... Ледзьве яно закончылася, як я ад Конанава даведаўся, што ніякага рашэньня не прынята і як усё адбывалася. Кісялёў пацікавіўся, чаму прадастаўлены праект пастановы не завізіраваны Бураўкіным і чаму той адсутнічае тут? АТК патлумачыў, што заняты з высокім маскоўскім госьцем, а візіраваць наадрэз адмовіўся, патрабуе, каб быў яшчэ адзін пункт аб вызваленьні яго ад пасады па ўласным жаданьні, прасьцей кажучы паставіў пытаньне рубам: альбо прагграма, альбо ягоная адстаўка. Прайшоў незадаволены шумок: бач ты, надумаў ставіць ультыматумы... Конанаў не сказаў, хто высунуў, але тут жа стала абмяркоўвацца нечая радыкальна-рэвалюцыйная прапанова – адхіліць Бураўкіна ад пасады за стварэньне ідэалагічнай правакацыі, заадно – выключыць з партыі. Але страсьці-мардасьці астудзіў Кісялёў, разважыўшы: вызваліць, тым больш выключыць з партыі Бураўкіна мы заўсёды пасьпеем. А, магчыма, ён ведае нешта такое, чаго мы ня ведаем? І ў сваёй манеры нечакана зьвярнуўся да прысутных: хто з вас дзеля прынцыпу здольны паставіць на кон сваю пасаду, кар'еру, членства ў партыі, устаньце ці падыміце руку? Зьнячэўку ніхто не варухнуўся. Во, бачыце, працягваў Першы, то мо ня будзем пароць гарачку... І ўсе дружна пагадзіліся, што ня варта пароць гарачку...

Гэта была калі не перамога, то і не паражэньне. Чаго б там ні каштавала, а трэба ўратаваць праграму! Хочаш-ня-хочаш, а Паўлаў патрапіў у патавую сітуацыю: бюро не прыняло ягоную прапанову, значыць, ні ён, ні хто іншы ня можа спыніць праграму да адмены ранейшай пастановы. Невядома, колькі нам дадзена часу, але неабходна пасьпець зрабіць усё, каб патушыць ці хоць прытушыць пажар, супакоіць людзей. Дзеля выратаваньня праграмы трэба ісьці на кампрамісы і паўкампрамісы. Ну, напрыклад, чаргаваць: дзень гэты Хруша ў запісе, другі – наша Бульбінка. Пакуль будуць знаёмяцца і прывыкаць да “Калыханкі”. Супакоіць жа вайскоўцаў і іхнія сем'і ў Паставах – прасьцей простага... Каб не зацягваць час, пазваніў міністру сувязі Івану Міхайлавічу Грыцуку, гарадзенцу, з якім у мяне склаліся вельмі добрыя службовыя і неслужбовыя стасункі, папрасіў распарадзіцца тэлеграмай перакасіраваць на Нарачанскім рэтрансьлятары, які пакрывае сігналам Пастаўскі рэгіён, першую праграму ЦТ на звыклы, больш магутны перадатчык, заадно перадаць пад трансьляцыю ЦТ маламагутны стоватнік у Браславе, паскорыўшы ўвядзеньне ў дзеяньне яшчэ аднаго, значна навейшага і больш дасканалага, для рэспубліканскай праграмы. І адразу ж памчаў да Генадзя, які нецярпліва чакаў вестачкі з бюро. Ён званіў заклапочана ледзь ці ня кожную гадзіну: ну што чуваць? Яму хацелася пэўнасьці і яснасьці. Адчувалася, настроены ён вельмі песімістычна, хоць у душы ня згас праменьчык надзеі, тым ня менш зусім не падзяляў мой аптымізм, веру ў розум і цьвярозую разважнасьць. Маю інфармацыю ён успрыняў ледзь ці як нейкі цуд, уздыхнуў з палёгкай, ажывіўся, імгненна набыў сваю заўсёдную ўпэўненасьць, энергічнасьць. Тут жа знайшлі поўнае паразуменьне аб стратэгіі і тактыцы паводзінаў і дзеяньняў па ўратаваньні праграмы. Пазваніў дырэктару праграмаў Каваленку, распарадзіўся сёньня ж замест абвешчанай “Калыханкі” паставіць у запісе “Доброй ночи, малыши”, зрабіўшы абвестку, што па прапанове тэлегледачоў “Калыханка” і “Доброй ночи, малыши” будуць трансляваецца праз дзень, пачаў сьпешна зьбірацца на работу...

Больш за месяц, мусіць, з падачы Паўлава Бураўкіна трымалі ў чорным целе, ставіліся як да чалавека заведама асуджанага на пазбаўленьне пасады, мо нават выключэньне з партыі, таму на пасяджэньні бюро і іншыя адказныя нарады сталі запрашаць не яго, а ягонага намесьніка Чаніна. Ды па-мойму, гэта зусім, ну калі не зусім, то вельмі мала хвалявала Генадзя. Для нас з ім самым галоўным і важным было, што тэлефонная і пісьмовая пратэстная плынь з кожным днём

аціхае, рэзка зьмяншаецца, а праз тыдні два і ўвогуле згасла, усё пачало ўваходзіць у спакойнае рэчышча. Працягвалі паступаць, хіба, толькі патрабаваньні і просьбы як нашых, так і сумежных рэгіёнаў паскорыць трансьляцыю Беларускага тэлебачаньня. Усё гэта былі пытаньні тэхнічных службаў Мінсувязі, Мінбыту і Мінкамунгасу. З дапамогай гэтых лістоў і крытычных сігналаў я стараўся абвастраць праблему, аператыўна знаходзіць прыймальныя рашэньні. Былі, канечне, прэтэнзіі і творчага плану, да іх стараліся ставіцца гранічна ўважліва, рабіць высновы. У цэлым пра беларускую праграму ў тэлегледачоў склалася добрае ўражаньне, аб чым засьведчылі сацыялагічныя службы, многія нашы праграмы па папулярнасьці абыйшлі маскоўскія, а праз колькі месяцаў ніхто і не заўважыў зьнікненьня з эфіру Хрушы і Сьцяпашы, што выклікалі такую хвалю пратэстаў і ледзь не пагубілі беларускую праграму. Былі, вядома, і нашы пралікі – надта ж вялікае мелі жаданьне адразу, неадкладна закалыхваць дзетак на сон нацыянальнымі мелодыямі, нацыянальнымі казачнымі героямі. Не ўлічылі і рэальнасьць, і людскую, найперш дзіцячую псіхалогію... Гэткая ж нецярплівасьць, пасьпешнасцьь, памкненьне вырашаць далікатныя і тонкія пытаньні кавалерыйскімі наскокамі, думаю, потым, напачатку дзевяностых вельмі нашкодзіла нацыянальнаму адраджэньню...

Неўзабаве ня толькі тэлегледачы, але і начальства зразумела, наколькі добрую і важную справу зрабілі ў рэспубліцы, займеўшы свой незалежны тэлеканал, ужо нават кепска сабе ўяўлялі, як можна было туляцца са сваімі перадачамі па чужых тэлепраграмах, штотыдзень просячы ў першапрастольнай ласкі і часьцей за ўсё атрымваючы па прынцыпу вазьмі Божа, што мне нягожа. Нават Паўлаў, сьцяўшы зубы і праз зубы змушаны быў прызнаць: зрабілі правільна. А што яму заставалася, калі літаральна праз колькі месяцаў з вуснаў Кісялёва на прыёме кіраўнікоў тэлекампаніяў сацыялістычных і нейтральных краінаў, саюзных рэспублік пачуў найвышэйшую ацэнку ня толькі прафесійнай, але і палітычнай дзейнасьці Бураўкіна, які "ўратаваў ягоны, Першага сакратара, і бюро ЦК гонар, мужна прадухіліўшы глупства, якое намерваліся ўчыніць"...

Пасьля гэтакіх ацэнак Паўлаў аціх, палагаднеў, з неўласьцівай раней пачцівасьцю і дружалюбствам пачаў ставіцца ня толькі да Генадзя, але і да мяне, хоць яму часам было цяжка хаваць, што гэтае дружалюбства нацягнутае, робленае...

Я з жахам думаю: а што б сталася з нашай культурай, першымі тады, зусім кволенькімі парасткамі нацыянальнага адраджэньня, каб не было той перамогі, каб Бураўкін адчайна не паставіў на кон сваю міністэрскую пасаду, больш таго – сваё членства ў партыі? Ня ведаю, ня ведаю... Але ж, пэўна, той герой памянёных мемуараў наўрад ці змог бы на сваіх плячах выцягнуць усё нацыянальнае адраджэньне, нават калі тыя плечы былі насамрэч волатаўскія. Па самай просьценькай прычыне – адсутнічала б нацыянальнае тэлебачаньне, а дзе б ён знайшоў, хто б яго пусьціў на такую шматмільённую аўдыторыю для пропаведзі сваіх ідэяў і поглядаў? Ды яшчэ аўдыторую падрыхтаваную спрыяльна ўспрымаць гэтыя пропаведзі. Хто-хто, а я знутры добра ведаю, якія б мастадонты маглі акупаваць тэлебачаньне – не раўня сёньняшнім. Сёньняшнія пераважна прыслужваюць Мамоне, тыя ж верай і праўдай ламалі б хрыбты за ідэю вялікай і непадзельнай... А маладзейшаму чытачу, які проста ня можа зразумець, у чым тое геройства паставіць на кон сваю партыйнасьць, мусіць, варта патлумачыць, што выключэньне з партыі тады было раўназначна, а часам і больш судзімасьці. Асабліва, калі каго, як гэта меркавалася Бураўкіна, выключалі па ідэалагічных, палітычных матывах. Гэта значыла, што раз і назаўсёды трэба забыцца пра ўсялякую службовую кар'еру, паколькі выключаны меў права займаць толькі радавыя і непрэстыжныя пасады, а калі то быў чалавек творчай працы, то падпадаў пад асабліва пільнае і прыдзірлівае вока цэнзуры, перад ім наглуха закрываліся старонкі ўсіх выданьняў. Так што было чым рызыкаваць Генадзю Бураўкіну... Але гэта к слову...

*Працяг будзе.*